Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

16-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

ПАНЯДЗЕЛАК 19 СЬНЕЖНЯ 1932 г. № 279 (3648)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 7-69
Адказн. сакратар 4-78
Сакратар . . . 6-15
Рэдакцыя 12-65 (дзённіка)
Выдавецтва . . . 2-44

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 1 руб
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымаецца выключна на пошце і літаносцамі.
Рукапісы не зьвяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ: 1 радок помаркі 1 руб.
КОШТ ПУБЛІКАЦЫ дакументу аб згубе 2 руб.

Дырэктыва пленуму будзе выканана

ДУБРОЎНА. (Ад наш. спец. кар.). 18-га сьнежня ў тонар прыезду старшыні ЦВК т. ЧАРВЯКОВА калгасьнікі і беднякі і сераднякі аднаасобнікі арганізавалі масавыя чырвоныя абозы. З самай раніцы ў Дуброўну пачалі прыбываць чырвоныя абозы з валакном, лёнам, хлебам, мясам і іншымі прадуктамі сельска-гаспадарчай вытворчасьці. У чырвоных абозах удзельнічала каля двух тысяч фурманак.

На базарнай плошчы адбыўся мітынг, на якім перадавыя калгасы рапартавалі аб выкананьні пляну ўсіх відаў загатовак. Калгас «ХВАЛЯ РЭВАЛЮЦЫІ», які плян загатовак выканаў прыехаў чырвоным абозам з рознымі прадуктамі звыш пляну. Выступаўшыя на мітынгу прадстаўнікі калгасаў і аднаасобнікаў азнаёмілі партыю і ўрад, у твары т. ЧАРВЯКОВА, што ў вызначаныя тэрміны Дубровенскі раён поўнасьцю выканае плян загатовак.

На мітынгу выступаў т. ЧАРВЯКОЎ, які перадаў ад ЦК партыі і ўраду падзяку перадавым калгасам, перадавікам аднаасобнікам, выканаўшым цалкам свае абавязацельствы перад дзяржавай і заклікаў калгасьнікаў і беднякоў і сераднякоў у тэрмін выканаць плян загатовак усіх відаў.

Раённыя і сельскія арганізацыі Дуброўенскага р-ну абавязаліся своечасова ажыцьцявіць дырэктыву сьнежаньскага пленуму ЦК аб поўным выкананьні пляну загатовак. У сельсаветы выехалі ўпаўнаважаныя РК і РВК.

Кармам--правільны ўлік, рацыянальнае выдаткаваньне

Зімоўка жывёлы—адзін з адказьнейшых перыядаў у рабоце МТФ і СТФ. Іменна на выніках зімоўкі будзе праверацца работа саўгасаў і калгасаў па практычным ажыцьцяўленьні імі задач вырашэньня малочна-мясной праблемы.

На аснове сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі апошнія два гады прынесьлі саўгасным і калгасным жывёлагадоўчым фэрмам буйнейшыя перамогі. Гэтыя перамогі асаблівоча выразна вызначаюцца ў росьце маладога і сьвінагадоўчага паголоўя. Падамо дзьве лічбы: 207116 галоў малочнае жывёлы маюць на сёньняшні дзень саўгасы і калгасы, і 290000 штук сьвіней. Такавы колькасны рост паголоўя, з якім уступілі ў зімоўку саўгасы і калгасы БССР.

Але адзначаючы буры рост паголоўя, партыя і ўрад у той жа час падкрэсьлілі недапушчальна нізкі ўзровень прадукцыйнасьці жывёлы. Прадукцыйнасьць саўгасных і калгасных фэрм рэзка адстае ад агульнага росту паголоўя. Мы стварылі буйнейшае па памерах стада, і ўжо тым самым павялічылі колькасьць выпускаемай на савецкі рынак прадукцыі жывёлагадоўлі. Але колькасьць гэтай прадукцыі магла і павінна быць значна большаю. Трэба сказаць, што, за рэдкім выключэньнем, саўгасы і калгасы недастаткова выкарыстоўваюць усе магчымасьці, якія закладзены ў сацыялістычнай гаспадарцы. Нізкая ўдойнасьць і ўкормленасьць асабліва ў часе зімовага перыяду—першая аднака дрэннага догляду за жывёлай.

Ускрываючы недахопы ў рабоце па асобных саўгасаў і калгасаў, паказваючы на карэньні гэтых недахопаў, на канкрэтных вінавайцаў, партыя ў той-жа час дала разгорнутую канкрэтную праграму барацьбы за сацыялістычную жывёлагадоўлю.

Забясьпечанасьць стада добрым пашыванкам, арганізацыя догляду, каармаздабываньне — важнейшыя ўмовы, без якіх немысьлімы посьпехі зімоўкі. Аб гэтым асабліва выразна гаворыць урокі зімовак мінулых год. Буйныя страты панесьлі тыя гаспадаркі, якія не забясьпечылі фэрмы кармамі, ня мелі адпаведных памяшканьняў, дрэнна даглядалі жывёлу.

Трэба цьвёрда памятаць, што адным з рашаючых фактараў пасьпяховай зімоўкі зьяўляюцца кармы. Іменна кармы вырашаюць посьпех барацьбы за прадукцыйнасьць стада, ад наяўнасьці кармоў і ўменьня іх выдаткаваньня залежыць рост паголоўя, умацаваньня фэрмы.

Ад вясковых ячэек і сельсаветаў патрабуецца ўпартая сыстэматычная работа на стварэньні кармовых рэсурсаў. Кармовую базу для ўласнай фэрмы абавязан мець кожны саўгас, кожны калгас.

Вопыты мінулых год паказалі, наколькі важнае значэньне набывае правільнае выдаткаваньне кармоў на працягу ўсяго году. Мала стварыць кармовы балянс, патрэбна правільная рацыянальнае іх выдаткаваньне. А між тым на гэты бок справы мала зьвяртаецца ўвагі. Хіба ня былі выпадкі ў мінулую зімоўку, калі некаторыя калгасы, якія мелі з восені нават лішкі кармоў, на весну ня мелі чым карміць жывёлу. Разбазарваньне, неэканомнае выдаткаваньне, адсутнасьць ўліку кармоў—такавы прычыны, якія часта прыводзяць да веснавой бяскормицы.

Надаючы асаблівае значэньне кармам, ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове ад 24 лістапада, абвяшчаючы ўсебеларускую самаправерку зімоўкі, прапанаваў неадкладна прыступіць да ўліку, вызяленьня і перадачы кармовых рэсурсаў фэрмам. Ускласьці адказнасьць за правільнае выдаткаваньне і захаваньне кармоў на поўных людзей у сапраўдлістычнай гаспадарцы—хіба гэтыя дырэктывы партыі ня маюць буйнейшага палітычнага значэньня? Што азначае ўзяць на ўлік кожны кілёграм кармоў, устанавіць адказнасьць за іх захаваньне? Гэта значыцца нанесьці сур'ёзны ўдар па кулацкай абязьлічыцы, пад прыкрыцьцём якое разбазарваюць, топчуць у гной, выдаючы «на вокка», псуюць, крадуць тысячы тон кармоў.

Калі барацьба з крадзяжом збожжа ў большасьці калгасаў узьнята на ўзровень важнейшай палітычнай задачы і злачынцы прыцягваюцца да адказнасьці, дык гэтага нельга сказаць у дачыненьні кармоў. У радзе месц дырэкцыі саўгасаў і праўленьні калгасаў да крадзяжу кармоў адносяцца ліберальна. А між тым кулак і яго агенты асабліва тут, на гэтым вучастку, праяўляюць сваю шкодную дзейнасьць. Пры патураньні апартуністычных элемэнтаў, кулак праз сваіх агентаў унутры калгасу ўжывае рознастайныя метады разбазарваньня кармоў, пачынаючы з крадзежу і канчаючы неэканомным, безгаспадарчым выдаткаваньнем.

Калгасная ўласнасьць сьвяшчэнна і недатыкальна. Гэта адносіцца ў такой жа ступені да кармоў, як і да ўсялякай іншай калгаснай маемасьці. Бескантрольнае, безгаспадарчае выдаткаваньне кармоў, парушэньне рацыёну кармленьня, крадзеж, павінны разглядацца як праявы клясавага ворага, па якіх трэба біць са ўсёй рашучасьцю.

Адным з важнейшых мерапрыемстваў па захаваньні кармовых рэсурсаў зьяўляецца правільнае іх прыгатаваньне і выдаткаваньне. Устанавіць і суровa прытрымліваецца рацыёну—гэта значыць не выдаткоўваць кармы «на вокка», ня кідаць пад ногі жывёле, а ў адпаведнасьці з запатрабаваньнямі зоатэхнікі дабіцца максымальнай эфэктыўнасьці кармленьня. Беражлівыя адносіны да кармоў павінны ўвайсьці ў сьвядомасьць кожнага рабочага саўгасу, кожнага калгасьніка.

Абкружыць фэрму клопатамі ўсяго калгасу, усёй калгаснай грамадзкасьці і тым самым забясьпечыць ня толькі захаваньне кармоў, але адшукаць новыя крыніцы кормаздабываньня—першачарговая задача партячэйкі і савету. Ці варта даводзіць бясспрэчнасьць таго, што гэтыя крыніцы мае кожны калгас, кожны саўгас? Кіраўніцтва саўгасаў і калгасаў пры складаньні кармовага балянсу звычайна прывыкла чамусьці рабіць асноўны ўпор на сена і канцэнтраты, і зусім мала зьвяртаецца ўвагі на сакавітыя кармы. Бурда, бульбяная мязга, макуха, жолуд, адкіды харчаваньня, галінкавы корм—усё гэта найкаштоўнейшыя кармы, якія выкарыстоўваюцца зусім мала. А між тым гэтыя кармы, танны і па сваёй спажыўнасьці зьяўляюцца невычарпальнай крыніцай павышэньня прадукцыйнасьці жывёлы.

Барацьба за павялічэньне прадукцыйнасьці жывёлы на зімовым яе ўтрыманьні—важнейшы вучастак барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Ня трэба забываць, што барацьба за якасьць сацыялістычнай жывёлагадоўлі немысьлімa па-за сувязьзю з іншымі мерапрыемствамі, якія вынікаюць з цэнтральнай задачы калгаснага будаўніцтва. Улік захаваньня кармоў, рацыянальнае іх выдаткаваньне, правільная арганізацыя брыгадзіраў фэрмы пры на фэрме, своечасовае выкананьне дзяржаўных плянаў загатовак, захаваньне сацыялістычных прынцыпаў разьмеркаваньня калгасных даходаў—вось цесна зьвязаны непарыўны комплекс мерапрыемстваў па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Разгортваючы самаправерку па арганізацыі зімоўкі, задача партячэек і сельсаветаў—павярнуць увагу шырокіх калгасных мас, рабочых саўгасаў тварам да фэрмы. Разам з гэтым сама праверка павінна стаць магутным вагаром у справе выкананьня пляну загатовак, асабліва па мясе. Іменна па выніках выкананьня сваіх абавязкаў перад дзяржавай па здачы (продажы) прадукцыі трэба ацэньваць работу фэрмы.

Ніводнага кілёграму збожжа перанупшчыну і спэкуляцыі

Апартуністы--агенты клясавага ворага

Тарасаў, Болбас, Бокі зрываюць збожжазагатоўкі ў Продзьвінскім сельсавеце

Тэрмінова і рашуча аздаравіць сельсавет, ушчэнт разьбіць сабатаж кулака

У палоне апартуністычных тэмпаў і ўплываў

Лічба па збожжазагатоўках у БАБРУЙСКІМ раёне дасягае звыш 70 проц., а ў КАЗУЛІЦКІМ сельсавеце—103 проц. У гэты самы час ПРОДЗЬВІНСКІ сельсавет у глыбокім прарыве: на 10 сьнежня плян выкананы толькі на 36,8 проц. прычына гэтаму—страта клясавай пільнасьці і бальшавіцкай нарыстасьці ў адносінах да варожых элемэнтаў з боку старшыні сельсавету партыйца Тарасава і бязьдзейнасьць працоўчых у сельсавеце партыйцаў і камсамольцаў.

ельскі актыў дыбам

Сакратар сельсавету Асецкі ўслаўлены п'яніца—п'е на хрэсьбінах у Бока га, п'е на вясельлі ў в. Баравой, п'е і ў іншых месцах. Гарэлка зьмягчае характар Асецкага, ён добры... У адсутнасьць старшыні сельсавету, кары стаючыся пячаткай, выдае даведкі на самол усім жадаючым: «Дзкрэт такі ёсьць, можна ўсім даваць»!

Рахункавод сельсавету—сын цьвёрдазаданьніка. Намесьнік старшыні сельсавету Болбас—працаўнік па фінансах—зрывае плян збожжазагатовак. Свае самаабавязацельствы ў 7 пудоў збожжа ня выконвае. Наогул, Болбас «прыкметны» чалавек.

Яго выгналі з калгасу—ён у намесьнікі старшыні трапіў, ды яшчэ партыйныя брыгады па вёсках разьмяркоўвае.

Ад гэтай «тройцы» недалёка адсоль чылі члены сельсавету. ЛІПСКІ, з в. Даманова, проста так і гаворыць кам году: «Збожжа здавець ня буду». Ды што ЛІПСКІ? Яго сябра па в. Дамана І. КРАШЭНСКІ адкрыта агітуе супроць пляну і ня прызнае ніякіх сельсаветаў і брыгад.

А вось старэйшы член сельсавету БОКІ. Гэта «тонкі палітык». Ён вельмі любіць аб'ектыўныя прычыны і даказвае нярэальнасьць пляну. БОКІ правальвае выкананьне самаабавязацельстваў і спагнаньне цьвёрдых заданьняў.

Увесь гэты кулацкі актыў зрывае работу сельсавету, зрывае і ўсімі сіламі сабатуе збожжазагатоўкі.

Аб тым-жа, як змагаюцца за выкананьне збожжазагатовак партыйны актыў, кажуць факты. Вёска Стасаўка плян па збожжы выканала толькі на 20 проц. Прымацаваныя да яе партыйцы ЛАГУН, РАЙХДУН, ШКЛЕЙНІК. Вёска Даманава І плян па збожжы выканала на 15 проц.; прымацаваны да яе партыйцы РУДКОЎСКІ, ЛІЦЬВІНКА, ЖЫЗЬНЕЎСКІ, САВІЧ. Вёска Даманава II не здала ніводнага кілёграму збожжа: прымацаваны да яе партыец БОКІ. Прыкладна такі малюнак і ў іншых вёсках, з іншымі прымацаванымі да іх партыйцамі. Трэба сказаць, што прымацаваныя зьяўляюцца адказнымі работнікамі: лясныя тэхнікі, каапэрацыйныя работнікі, сакратары партячэек, але ня гледзячы на гэта зруху ў загатоўках няма.

Слухалі—пасганавілі... аб чым і забылі

14 сьнежня г. т. гістарычнае пасяджаньне прэзыдыуму сельсавету. Старшыня Тарасаў, член Гарбачэўскі (загатоўшчык каапэрацыі—праваліў плян каапэрацыйных загатовак па гародніне і садавіне) і Атрушкевіч (настаўнік, аб якім сяляне пісалі ў «Зьвязду», што ён горкі п'яніца). І вось гэтая славутая тройка залпам, пачкамі разгледзела 12 заяў цьвёрдазадальнікаў і са ўсіх іх зьняла цьвёрдае заданьне. Вынікі гэтакай «клясавай» лініі кутка сказаліся: былыя цьвёрдазаданьнікі не здаюць збожжа. Характэрны выпадак: былы цьвёрдазаданьнік в. Кабылічы МАКАРОНЧАНКА ў 1931 г. па цьвёрдым заданьні здаў 50 пудоў збожжа, у гэтым годзе з закладзеных на яго 26 пудоў, здаў усяго паўтара пуды, у той-жа час бядняк, член сельсавету, т. БАЩАК МІКІТА сваё самаабавязацельства ў 2 пуды перавыканаў.

Аслабанілі ад цьвёрдых заданьняў гаспадаркі, якія маюць у сярэднім сенапахаці 10 га, пры падатку ў 70 руб., але-ж за тое кампэнсавалі абкладаньнем цьвёрдага заданьня сераднякоў, у якога сенапахаці 5-6 га. і падатак плаціць 58 руб.

Аб тым-жа змыканьні з кулаком і патураньні кулацкаму сабатажу гаворыць «работа» вучастковага міліцыянера-партыйца Новікава. Ён умудрыўся з 11 судовых загадаў выканаць толькі 3.

Ці другі выпадак: МАКАРОНЧАНКУ далі цьвёрдае заданьне ў 40 пудоў бульбы. Ён не аддае, кажа: няма. Та ды бядняк калгасьнік кажа брыгадзіру:—назначце яму 90 пудоў і дайце два дні тэрміну. Падумаў брыгадзір, параіўся з сельсаветам, далі заданьне ў 70 пудоў і бульба была вывезена. Гэты прыклад сельсавет ня ўлічыў, а ён надзвычайна характарна паказвае, як кулак сабатуе загатоўкі, і як пры больш рашучым нажыме ён выконвае заданьні.

На фоне агульнага зрыву пляну па збожжы ў сельсавеце ёсьць паказальныя вёскі, ёсьць асобныя ўдарнікі. Вось вёска «Глебава Рудня». Заданьне па збожжы ў 300 пудоў ужо выканана на 290 пудоў. Гэтыя перадавікі сельсаветам не заўважаны.

Зрабіць пералом

Плян збожжазагатовак кінуты на апартуністычны самацёк. Рэальнасьць пляну даказана вёскай «Глебава Рудня», ці Даманава II. Але ні сельсавет, ні брыгадзіры не праяўляюць бальшавіцкай настойлівасьці ў барацьбе за збожжа і барацьбе з кулацтвам і кулацка - заможнымі элемэнтамі вёскі. Бядняцка - сераднякоўская масы сельсавету не мабілізаваны супроць кулацкага сабатажу. Засьмечанасьць сельсавету прахадзімцамі, людзьмі, якія даўно страцілі сваю клясавую пільнасьць, прыводзіць да сумных вынікаў. Партыйцы сельсавету падпалі пад кулацкі ўплыў і зрабіліся на справе апартуністамі.

Неабходна праверыць работу Продзьвінскага сельсавету. Трэба зьмяніць кіраўніцтва яго. Пералом у загатоўках павінен наступіць неадкладна.

Вараб'ёў.

Калгасьнікі зязуць з божжа на элеватар.

Перадавікі збожжазагатовак

(раёны, якія перавыканалі плян)

1. Жыткавіцкі.
2. Тураўскі.
3. Камарынскі.

Чорная дошка

Заносім на дошку наступныя раёны, якія ганебна зрываюць выкананьне пляну па збожжы

(выкананьне пляну ў проц.)

1. Чырвонапольскі	37,6
2. Горацкі	38,8
3. Крупскі	42,2
4. Буда-Кашалеўскі	44,2
5. Прапойскі	44,4
6. Чачэрскі	44,9
7. Рэчыцкі	45,3
8. Лоеўскі	46,1

Узмацніць мабілізацыю сродкаў з аграмаджанага сэктару

Гарадзкім саветам, райвыканкомам, местачковым і сельскім саветам

Да завяршэньня вялізарнейшага пляну першай пяцігодкі засталіся лічаныя дні. На ўсіх вучастках гаспадарчага і культурнага будаўніцтва з ня бывалай энэргіяй разгортваецца барацьба за датэрміновае выкананьне і перавыкананьне пляну першай пяцігодкі. Поўнае і бесьперабойнае фінансаваньне ўсіх мерапрыемстваў у гэты час мае актуальнейшае значэньне.

Між тым выкананьнем фінансавага пляну IV кварталу—пляну мабілізацыі сродкаў і паступленьняў дзяржаўных плацяжоў у бюджэт ад прадпрыемстваў аграмаджанага сэктару, па радзе раёнаў праходзіць такімі тэмпамі, якія не гарантуюць поўнага выкананьня квартальнага пляну. У той час, як паасобныя раёны (Заслаўскі, Жыткавіцкі, Лёзьненскі, Мсьціслаўскі, Сіроцінскі), ужо перавыканалі кварталы плян мабілізацыі сродкаў, але на іншых раёнах вызначаецца яўная пагроза невыкананьня пляну.

Асаблівае адставаньне наглядаецца ў галіне добраахвотных плацяжоў па вёсцы. Зацягнулася рэалізацыя пазыкі, асабліва сярод аднаасобнага сэктару, паслабла ўвага да справы хаваньня вольных сродкаў насельніцтва ў касах ашчаднасьці, ня прымаецца належных мер да ўзмацненьня фінансавай гаспадаркі спажывецкай каапэрацыі шляхам узмоцненьня лаявых узносаў, у выніку чаго не скарыстоўваюцца маючыяся магчымасьці па палепшаньні забавальненьня працоўнага насельніцтва прадметамі шырокага спажываньня.

Усё гэта сьведчыць аб недастатковым разгортваньні мясцовымі саветамі масавай работы вакол выкананьня фінансавага пляну IV кварталу, аб не дастатковым кіраўніцтве гэтай справай з боку гарсаветаў і райвыканкомаў паасобных раёнаў.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР АБАВЯЗВАЕ гарадзкія саветы, райвыканкомы, местачковыя і сельскія саветы спэцыяльна абмеркаваць гэтае пытаньне на паседжаньнях прэзыдыума і неадкладна праверыць работу ад падведных устаноў і арганізацый.

Шляхам чоткага кіраўніцтва ўсёй апэрацыйнай работай па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў і разгортваньня шырокай масавай работы забясьпечыць бязумоўнае выкананьне ў строга вызначаныя тэрміны ўсіх абавязковых плацяжоў насельніцтва ў прыватнасьці поўнае спагнаньне абавязковых плацяжоў з кулацкіх гаспадарак, і дабіцца неадкладнага пералому ў выкананьні пляну добраахвотных плацяжоў, асабліва ў галіне рэалізацыі пазыкі на вёсцы і прыцягненьня ўкладаў у ашчадкасы.

На працягу двух дэкад правесьці праверку паўнаты і своечасовасьці паступленьняў у бюджэт узносаў па ўсіх прадпрыемствах аграмаджанага сэктару.

Актывізаваць работу грамадзкіх органаў садзейнасьці выкананьню фінансавага пляну — камсодаў, фінансавых сэкцый саветаў, ператварыць фінсэкцыі ў цэнтральныя штабы мабілізацыі ўсяе грамадзкасьці на барацьбу за поўнае выкананьне фінансавага пляну, шырока скарыстаўшы ў гэтых мэтах абвешчаны ЦВК 23-XI конкурс на лепшую фінансавую сэкцыю саветаў.

Уся работа па выкананьні фінансавага пляну IV кварталу павінна быць праведзена на грунце ўцяжненьня ў фінансавую работу шырокай грамадзкасьці са строгім захаваньнем рэвалюцыйнай законнасьці. Усякім перагібам і парушэньням дырэктыў партыі і ўраду ў фінансавай рабоце павінен быць даны рашучы адпор. Асаблівую ўвагу гарадзкіх саветаў і райвыканкомаў ЦВК зварочвае на своечасовасьць разгляду скаргаў працоўных, на няправільнае абкладаньне, непрадастаўленьне ільгот і г. д.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт ЗВАРОЧВАЕ ўвагу райвыканкомаў Стара - Дарожскага, Церахаўскага, Лоеўскага, Чэрыкаўскага, Бялыніцкага, Горацкага, Уваравіцкага, Нараўлянскага, Дуброўеньскага, Глускага, Чырвонапольскага, Рэчыцкага, Кармянскага і Прапойскага раёнаў на недапушчальна слабыя тэмпы выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў IV кварталу, лічыць кіраўніцтва гэтай справай з боку РВК памянёных раёнаў незадавальняючым і АБАВЯЗВАЕ пад асабістую адказнасьць старшыень РВК шляхам шырокай мабілізацыі грамадзкасьці, неадкладна ліквідаваць дапушчаны прарыў.

Ад усіх гарадзкіх саветаў, райвыканкомаў, местачковых і сельскіх саветаў ЦВК КАТЭГАРЫЧНА патрабуе баявога, апэрацыйнага кіраваньня ўсёй арганізацыйна - масавай работай па выкананьні фінансавага пляну і поўнага выкананьня квартальнага пляну па ўсіх абавязковых і добраахвотных плацяжох. Асаблівае значэньне ЦВК надае рабоце намесьнікам старшыень сельсаветаў па фінансавых справах, на якіх ЦВК усклада ўсю адказнасьць за работу фінансавых сэкцый сельсаветаў, за дакладнае выкананьне бюджэтаў сельсаветаў, за поўнае спагнаньне абавязковых і збор добраахвотных плацяжоў і за ўсю пастаноўку ў сельсаветах палітычна-масавай работы вакол задач выкананьня фінансавага пляну.

Старшыня ЦВК БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.
В. аб. Сакратара ЦВК БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

Лёнапра укцыю—садыялістычнай прамысловасьці

ЗЛАМАЦЬ КУЛАЦКІ САБАТАЖ!

Ачысьціць Бярэзьнёўскі і Багуцкі сельсаветы ад кулацкіх агентаў, што тармозяць лёназагатоўкі

Чаму Асьвейшчына апынулася ў глыбокім прарыве

АСЬВЕЯ. (Ад наш. спэцкора). Асьвейскі раён зьяўляецца адным з буйнейшых лёнаводных раёнаў БССР. Паводле пляну, па раёне трэба сёлета загатовіць 2.300 цнт. лёнавалакна і 1.800 цнт. семя.

Але з самага пачатку кампаніі раённыя арганізацыі пусьцілі лёназагатоўкі на самацёк. У выніку гэтага плян загатовак па лёнавалакне выкананы ўсяго на 8 проц., а па семі—на 22,4 проц.

Ня гледзячы на неаднаразовыя дырэктывы партыі і ўраду аб паскораньні тэмпаў апрацоўкі лёну, у раёне апартуністычна адносяцца да гэтага важнейшага пытаньня. Замест 80 лёнапільных пунктаў працуе толькі 7. Але і гэтыя цалкам не забясьпечаны палівам.

За якасьць валакна ў раёне ніхто не адказвае. У радзе сельсаветаў і калгасах, але ні кіраўніцтвы сельсаветаў, ні партячэйкі ня прымаюць ніякіх мер, каб сабраць трасту са сьцелішчаў і пусьціць на апрацоўчыя пункты. Чаго варта такая работа, калі ў калгасе «Новы шлях» (Сухаруцкі сельсавет) лён з 70 га стаіць на поплаве ў кучках, ці калгасе «Размах» не падабрана лён ураджаю з 63 га? Гэта нядбайства да апрацоўкі трасты даходзіць да таго, што ў некаторых выпадках яно мяжуе са злачынствам. Напрыклад, калгас «Канчане» скінуў каля брамы лёназаводу некалькі вазоў трасты толькі таму, што кіраўніцтва заводу адмовілася прыняць яе. Ні завод, ні праўленьне калгасу ня ўжылі ніякіх захадаў, каб падсушыць трасту і пусьціць яе ў перапрацоўку.

Загатоўкі лёну па раёне, асабліва па аднаасобным сэктары, сыгналізуюць аб пагрозе зрыву пляну (6 проц.). Паасобныя сельсаветы, як Красоўскі, Савейкаўскі, Кісялеўскі, выканалі плян загатовак у самых нізкаватых разьмерах. Рад сельсаветаў нічога ня робіць па спагнаньні цьвёрдых заданьняў з кулацка - заможных гаспадарак. На сёньняшні дзень цьвёрдыя заданьні выкананы толькі на 20 проц. Па Асьвейскім, Савейкаўскім, Красоўскім і Малашкаўскім сельсаветах кулакі не здалі ніводнага цэнтнэру валакна.

Рубам трэба паставіць пытаньне аб спагнаньні цьвёрдых заданьняў з кулацка - заможных гаспадарак. Абаронцы кулакоў павінны быць пакараны. Цьвёрдыя заданьні трэба цалкам спагнаць на працягу бліжэйшай дэкады.

Да 1-га студзеня Асьвейшчына павінна загатовіць ня менш 80 проц. гадавога заданьня.

Сквярнюкоў.

Перадавікі лёназагатовак

ВЕТКА. ТАРАСАЎСКІ сельсавет атрымаў вялікую перамогу на фронце лёназагатовак. Плян па лёнавалакне выкананы на 194 проц., па семі—100 проц. Гэтых посьпехаў сельсавет дапогся ў выніку разгортваньня шырокай масавай работы сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў, рашучага націску на кулацка-заможныя гаспадаркі.

У часе апрацоўкі лёнатрасты ў калгасах сельсавету было шырока разгорнута сацыяборніцтва і ўдарніцтва паміж паасобнымі брыгадамі і паасобнымі калгасьнікамі.

Партыйная ячэйка і кіраўніцтва сельсавету не давалі патолі кулацка-заможным гаспадаркам і прымусілі іх выканаць цьвёрдае заданьне ў строга вызначаныя тэрміны. Так змагаюцца вызначаныя тэрміны. Так змагаюцца за тэхкультуру перадавыя сельсаветы.

П.

МАЗЫР. Калгасы КРУКАВІЦКАГА сельсавету цалкам выканалі плян па загатоўках лёнавалакна, каналі і пянькі. Некаторыя калгасы нават значна перавыканалі пляны загатовак. Так, калгас імя МОЛАТАВА здаў (прадаў) 8 цнт. валакна (супроць пляну ў 1 цнт.), калгас «ПЯЦІГОДКА»—7 цнт. (паводле пляну 6 цнт.).

Загатоўкі тэхкультур працягваюцца.

А. Ш.

Тарасаў і Кавалёў--на повадзе ў кулака

БАБРУЙСК. (Наш кар.) Да апошняга часу раён не разгарнуў бальшавіцкай барацьбы за лён. Плян лёназагатовак выкананы ўсяго на 47 проц. Другая пяцідзёнка сьнежня дала прырост толькі на 4 проц. Рад сельсаветаў (Продзьвінскі, Падрэцкі, Берасьнёўскі, Лешчанскі) за апошнія дзьве пяцідзёнкі зусім спынілі загатоўкі.

Галоўная прычына нізкіх тэмпаў лёназагатовак — гэта апартуністычны самацёк, адсутнасьць барацьбы з кулакам, ворагам і яго агентурай, а часамі і простае патураньне кулацка - заможным гаспадаркам.

Узяць хоць-бы Продзьвінскі сельсавет, які выканаў плян толькі на проц. Старшыня сельсавету Тарасаў яўна абараняе кулакоў. Чамусьці зусім не атрымалі цьвёрдых заданьняў заможнікі Макаранчанка, Бушчык і рад іншых. Кіраўніцтва партыйнай ячэйкі, падпаўшы пад уплыў Тарасава, ня прымае захадаў да спагнаньня цьвёрдых заданьняў з кулацка - заможных гаспадарак і наогул ня кіруе заготоўкамі.

Па некаторых сельсаветах наглядаецца «чарговасьць» кампаній. Старшыня Берасьнёўскага сельсавету Кавалёў разважае: «дайце скончыць збожжазагатоўкі, тады прымемся за лён». Між тым кулацка - заможныя гаспадаркі гэтага сельсавету не здалі ніводнага кілё лёнавалакна; у калгасе «Памяць Ільліча» зусім не пачыналася загатоўкі лёну, траста ляжыць у кучках, псуецца, але сельсавет гэта мала турбуе.

Такое бадушша ў адносінах да кулацкіх гаспадарак мае месца і ў радзе іншых сельсаветаў раёну (Бортнікаўскі, Багушэўскі, Любонцкі, Падрэцкі), але раённыя арганізацыі ня прымаюць ніякіх захадаў да таго, каб ударыць па апартуністах і дамагчыся выкананьня пляну лёназагатовак. Справа дайшла да таго, што ў раёне, ні ў водным сельсавеце не вядзецца дакладнага ўліку спагнаньня цьвёрдых заданьняў.

Засталося вельмі мала часу. Бязьлітасным ударам па кулацкім сабатажы, па апартуністычнай бязьдзейнасьці сельсаветаў, праз разгортваньне масавай работы, Бабруйшчына абавязана да 1-га студзеня за атовіць ня менш 90 проц. гадавога пляну лёнавалакна.

Дамброўскі.

Агенты клясавага ворага пакрываюць кулакоў

ЕЛЬСК. (Наш кар). Спагнаньне цьвёрдых заданьняў па тэхнічных культурах з кулацка-заможных гаспадарак у раёне не праводзіцца. У той час, калі раённы плян па лёнавалакне выкананы на 72 проц., калі па радзе сельсаветаў (Меляшкоўскі, Качышчанскі, Багуцкі і інш.) калгасы і бядняцка-сераднякоўскія гаспадаркі цалкам выкналі або перавыканалі пляны, загатоўкі па цьвёрдых заданьнях зрываюцца. **На 10 сьнежня з кулацка-заможных гаспадарак не спагнана ніводнага кілё лёнавалакна і пянькі.**

Па Багуцкім сельсавеце заможнікі Крэйт Нічыпар і Клабук Зена маюць шмат лёнавалакна і пянькі, але і на сёняшні дзень яны ня выканалі загатовак. Намесьнік старшыні сельсавету Марка Сышчанка яўна стаў на шлях абароны кулака. Ад гэтага агента клясавага ворага можна пачуць такія словы: «У кулакоў нічога няма».

Добра адчуваюць сябе кулакі і ў Засінцаўскім сельсавеце пад абаронаю старшыні (ён-жа сакратар партячэйкі) Хэмеца Рыгора. Замест работы, Хамец штодня ходзіць у лес на палявaньне, а цьвёрдыя заданьні не спагняюцца.

Ня рупіцца аб лёназагатоўках і кіраўніцтва канторы Загатлёну. Загадчык канторы Пятроўскі справай загатовак ня кіруе, фонды прамтавараў, вызначаныя для прэміраваньня лёназдатчыкаў, Пятроўскі разбазарвае на права і налева.

Абаронцы кулака павінны атрымаць рэшуючы адпор. Цьвёрдыя заданьні трэба спагнаць неадкладна. Апрацоўваючы кулацкі сабатаж, кіруючыя раённыя арганізацыі павінны мабілізаваць шырокія масы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў на ўдарнае завяршэньне лёназагатовак.

Калгасьнікі здаюць на заготпункт лёнавалакно.

У барацьбе за выкананьне пляну збожжазагатовак

правяраць здольнасьць партячэек, кожнага камуніста паасобку змагацца за генэральную лінію партыі

Вытрымаць палітычны экзамен

Сьнежаньскі пленум ЦК КП(б)Б прызнаў ход выкананьня плянаў цэнтралізаваных загатовак яўна нездавальняючым.. Гэтая ацэнка поўнасьцю застаецца ў моцы да сёньняшні дзень; час, які мінуў са дня сканчэньня пленуму, ня даў яшчэ такога эрэху ў загатоўках, які-б забясьпечыў выкананьне пляну да ўстанаўленага пленумам тэрміну, г. зн. да 25 сьнежня.

Загатоўкі зьяўляюцца вучасткам самай упартай клясавай барацьбы. Кулакі і іх агенты намагаюць усе сілы на тое, каб сарваць выкананьне дзяржаўнага пляну збожжазагатовак і гэтым нанесьці ўдар па ўсім народна-гаспадарчым пляне. Іменна тут, у баёх з клясавым ворагам за збожжа, за лён, за мяса трымаюць экзамен партыйныя арганізацыі, партыйныя ячэйкі. Тут правяраецца іх баяздольнасьць змагацца за генэральную лінію партыі, тут выяўляецца твар кожнага камуніста, яго бальшавіцкая азагартаванасьць, ідэалёгічная ўстойлівасьць, яго ўменьне кіраваць ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы, уменьне весьці за сабой масы.

Слабасьць ходу загатовак тлумачыцца іменна тым, што шмат партыйных ячэек і нават некаторыя райкомы партыі ня вытрымалі палітычнага экзамену, аказаліся нездольнымі арганізаваць моцны адпор кулацтву, не ўмеюць належным чынам разгарнуць масавую работу. Больш таго, мы маем рад фактаў, простага зрастаньня паасобных камуністаў, а часта і сакратароў ячэек з кулаком. Мы сустракаем факты, калі члены партыі ідуць на паву ў кулакоў і падкулачнікаў. Аб гэтым гаворыць матар'ял, які мы сёньня зьмяшчаем з Путчынскай ячэйкі КП(б)Б (Дзяржынскі раён).

Рукамі такіх, з дазволу сказаць, як муністаў як Венцакоўскі кулак робіць сваю справу, пад крылом такіх апартуністаў клясавы вораг беспакаранна разгортвае сваю дзейнасьць. Пад прыкрыцьцём такіх як Венцакоўскі праводзяць падрыўную работу Гурукі, Адзінцовы, Віткоўскія і г. д. Такія камуністы, якія нездольны выконваць важнейшую задачу пастаўленую партыяй, якія фактычна здрадзілі партыі, ня могуць знаходзіцца ў нашых радох.

Да 25-га сьнежня плян збожжазагатовак павінен быць выкананы на 100 проц. Такая дырэктыва пленуму ЦК—яна павінна быць выканана безагаворачна. Посьпех у першую чаргу вырашае рашучы націск на кулацка-заможныя элемэнты. Трэба зламаць кулацкі сабатаж, трэба ў некалькі дзён спагнаць з кулакоў цьвёрдыя заданьні, самым рашучым чынам змагаючыся з гандлем збожжам да поўнага выкананьня рэспубліканскага пляну.

Разгорнутая палітыка - выхаваўчая работа сярод бядняцка-серадняцкай часткі аднаасобнікаў, веданьне кожнай вёскі, кожнага паселішча паасобку, штодзеннае апэрацыйнае кіраўніцтва ходам загатовак з боку партыйных ячэек, сельсавету, бязьлітасная барацьба з самацёкам—гэта ўмова, без чаго ня можа быць і гутаркі аб выкананьні пляну збожжазагатовак.

У барацьбу за збожжа павінны быць уключаны ўсе камуністы, усе камсамольцы і шырокія масы беспартыйнага актыву. Ня можа быць зараз ніводнага камуніста на вёсцы, які-б не змагаўся за выкананьне пляну збожжазагатовак.

Партыйныя ячэйкі абавязаны ў дні, якія засталіся да 25 сьнежня, разгарнуць вялізарнейшую апэрацыйную палітыка-выхаваўчую работу. Тут патрэбна праявіць максымальную мабільнасьць і гібкасьць, выкарыстоўваючы ўсе формы масавай работы. Забясьпечыць штодзеннае шпаркае нарастаньне тэмпаў ходу загатовак, выканаць плян да 25 сьнежня—ў гэтым зараз цэнтральная задача вясковых партыйных ячэек

Уменьне кіраваць рашае посьпех

СТАРОБІН. Гадавы плян збожжазагатовак па Старобінскім раёне на 10-га сьнежня калгасным сэктарам выкананы на 92,6 проц., а аднаасобнікамі толькі на 71,6. Адстаюць як і раней, ДЗЯКОВІЦКІ с.-савет, дзе плян выкананы на 72,5 проц. СУХАМІЛЬСКІ—на 72,0 і Чырвона-Дворскі сельсавет, які выканаў плян толькі на 70 проц.

У гэтых сельсаветах з самага пачатку збожжазагатоўчай кампаніі ня былі ўзяты неабходныя тэмпы. Тут панавала яўная недаацэнка палітычнага значэньня збожжазагатовак, спадзяваньне на самацёк. Старшыні гэтых сельсаветаў — ЧАРКАС, ЛАЗОЎСКІ, ВЯЛЬДЗІМОВІЧ — імкнуліся сарваць збожжазагатоўкі, заяўляючы, «мы ня будзем выконваць пляны». Апартуністычная практыка у гэтых сельсаветах перапляталася з парушэньнем рэвалюцыйнай законнасьці. Тут шырока ўжывалася адміністраваньне, арышты беднякоў і сераднякоў, масавыя штрафы.

Райком КП(б)Б рашуча ударыў па кулацкай практыцы і яе канкрэтных носьбітах.

Апартуністы, кулацкія абаронцы, выключаны з радоў КП(б)Б, зьняты з пасады старшыні сельсаветаў і адданы пад суд. Трэба адзначыць што рад сельсаветаў паказалі бальшавіцкія ўзоры барацьбы за выкананьне пляну збожжазагатовак, шырока разгортваючы сацпаборніцтва і ўдарніцтва, гра мадзкі буксір адстаючым, чорныя і чырвоныя дошкі. Да ліку такіх адносіцца Старобінскі сельсавет, які гадавы плян збожжазагатовак выканаў на 106,7 проц., Лістападаўскі—на 100,2 проц. і Доўгаўскі—на 100 проц. Выкананьне пляну гэтымі сельсаветамі яскрава сьведчыць, што плян зусім рэальны. Патрэбна толькі сапраўдная бальшавіцкая напорыстасьць, разгорнутая партыйна масавая работа, упартая і рашучая барацьба з кулаком і яго агентурай.

Х. Лагун.

КАЦЯ ПЯЦЕЛЬСКАЯ парторг брыгады фрэнчаў цвэйнай фабрыкі «Кастрычнік». Пад кіраўніцтвам Каці брыгада адваявала пераходны чырвоны сьцяг.

Кулацкі агент на чале парт'ячэйкі

Паказчыкі выкананьня пляну збожжазагатовак гавораць аб тым, што Путчынская парт'ячэйка КП(б)Б (Дзяржынскі раён) ірыя не сучасным кіраўніцтве ня здольна выконваць важнейшыя гаспадарча - палітычныя задачы. Ячэйка ўжо паказала сваю нездольнасьць змагацца з кулацкім элемэнтам, жмі самым упартым чынам часта зусім адкрыта падрывае выкананьне загатоўчага пляну. Аб гэтым гаворыць рад фактаў.

Да гэтага часу плян збожжазагатовак па сельсавеце выкананы толькі на 40 проц., прычым трэ процант выкананы калгасамі. Аднасобнікі выконваюць свае заданьні вельмі слаба. А сакратар парт'ячэйкі Венцакоўскі лічыць такое становішча цалкам нармальным. ВЕНЦАКОЎСКІ проста заяўляе, што «у аднаасобнікаў нічога ня возьмеш, бо у іх няма нічога».

Гэтыя настроі сакратара ячэйкі тлумачаць нам, чаму сярод аднаасобнікаў не праводзіцца ніякай масавай работы па выкананьні загатовак. Гэтыя-ж настроі разьвязваюць рукі такім кулацкім элемэнтам, як **Грук Міхась, Адзінец ВАСІЛЬ**, якія самі не выконваюць цьвёрдых заданьняў і адкрыта на сходах выступаюць супроць загатовак.

Беспакарным застаецца дзейнасьць падкулачніцы ВІТКОЎСКАЙ (з вёскі Паедыкава), якая на ўсіх сходах агітуе, каб не здавалі збожжа дзяржаве. У выніку гэтага плян загатовак па вёсцы Паедыкава выкананы толькі на 25 проц.

Партыйная ячэйка і сельсавет нічога ня зрабілі, каб арганізаваць рашучы адпор кулаку і каб узначаліць збожжазагатоўкі па сельсавеце, бо на чале парт'ячэйкі аказаўся кулацкі агент ВЕНЦАКОЎСКІ.

Дзіўна, чаму гэта Дзяржынскі РК КП(б)Б ня зьняў гэтага сакратара з работы з усімі выцякаючымі адсюль вынікамі

Васільлеў.

Ячэйка ня ведае, кім яна кіруе

ПЕТРЫКАВА. Скрыгалаўскаму сельсавету заданьне па збожжазагатоўках у гэтым годзе паменшана у 2 разы супроць мінулага году. На тэрыторыі сельсавету ёсьць патыйная і 3 камсамольскіх ячэек. Ёсьць і калгас.

Сельсавет меў усе магчымасьці, каб выканаць плян збожжазагатовак да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, як гэта зроблена вёскамі Лешня, Наддаткі, якія ўжо даўно выканалі плян на 150 проц.

Аднак сельсавет ня злазіць з чорнае дошкі. Кожная пяцідзёнка дае мізэрны прырост пляну (на 10-XI было 43 проц. гадавога заданьня, на 25-XI—44 проц.) і зараз сельсавет яшчэ не дасягнуў 50 проц. гадавога пляну.

Гэтыя недапушчальныя чарапашныя тэмпы становяцца зразумелымі калі хаця-б некалькі азнаёміцца з работай парт'ячэйкі.

Партыйная ячэйка амаль ня кіруе ходам збожжазагатовак па сельсавеце. Яна нават ня ніякага ўліку ходу выкананьня пляну, на кіруе вёскамі. Напрыклад, вёскі, ШАХОВІЧЫ і СКРЫГАЛАЎ адстаюць, а вёска БАЛАШЭВІЧЫ проста ухіляецца ад выкананьня пляну, а парт'ячэйка не вывучыла прычыны невыкананьня пляну гэтымі вёскамі. Між тым, у гэтых вёсках разгарнулі вялікую дзейнасьць кулацкія агенты, карыстаючыся палітычнай сьлепатой партыйнай ячэйкі. Акрамя гэтага назіраецца ўяўнае прымірэньцтва да заможнікаў, якія ня выконваюць цьвёрдых заданьняў. Так, заможнік БАКАВЕЦ КАРП (з вёскі ЛЕМНЯ) сам ня выконвае заданьне і другіх на гэта падбівае і да яго сельсавет ніякіх мер не ужывае.

Чорная і чырвоная дошка—гэта вельмі добры сродак, каб падцягнуць адстаючых і паказваць перадавікоў. Ёсьць шмат фактаў, калі ў вёсцы ЛЕМНІ сяляне назаўтра-ж пасьля таго, як іх заносілі на чорную дошку, выконвалі свае заданьні і прыходзілі прас'ць, каб іх зьнялі з чорнай дошкі, між тым вывешваньне чырвонай і чорнай дошкі ў сельсавеце не практыкуецца. Камсамольскія ячэйкі хаця і прымацавалі камсамольцаў да паасобных сяліб, але апошнія там нічога ня робяць. Такім чынам камсамольскія ячэйкі амаль ня ўдзельнічаюць у збожжазагатоўках.

Калі дадаць, што няма ніякай масавай работы вакол загатовак, што зусім не ўзьнята грамадзкая думка калгасьнікаў і бедняцка-серадняцкай часткі аднаасобнікаў,—дык становіцца зусім зразумелым, чаму сельсавет такімі ганебнымі тэмпамі выконвае сваё заданьне.

Вывады напрошваюцца самі. Трэба самым рашучым чынам спыніць апартуністычныя адносіны да загатовак. Трэба скончыць з прэмірэнцтвам да кулака. Трэба праверыць хто ўзначальвае Скрыгалоўскую парт'ячэйку.

Барыс Куперман.

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"
Стар. 2 № 277 (3646)

Адказаць канкрэтнымі справамі

на заклік заводзкага друку заводу „Бальшавік" і імя Молатава

Выклікаем шматтыражку заводу імя Сталіна і Менскай абутковай

Савецкі саюз пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі пасьпяхова заканчвае выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады і ўступае ў другую пяцігодку, пяцігодку пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Пасьпяховае завяршэньне другой пяцігодкі залежыць ад падзяленьня пад яе моцнае фінансавай базы.

Наш чырвонасьцяжны «БАЛЬШАВІК» пад правільным кіраўніцтвам партарганізацыі з году ў год, з кварталу ў квартал сыстэматычна перавыконвае свой прамфінплян. Але побач з гэтым, наш завод мае ганебны прарыў па выкананьні фінпляну. Плян па паступленьні ўкладаў у ашчадкасу выкананы заводам на 45,2 проц., Калектыўным страхаваньнем ахоплена 88 проц. рабочых. Пазыка рэалізавана (на 22-XI) на 84,17 проц.

Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што мы вялі слабую барацьбу за фінплян. Камсоды амаль ва ўсіх цэхах бязьдзейнічалі. Дэпутацкая група таксама вяла слабую барацьбу за фінплян. Штодзённі ў цэхах да пачатку конкурсу слабо асьвятлялі гэтае пытаньне.

Ашчадкаса не перабудавала сваю работу, увесь цяжар работы ня быў перанесены ў цэх і брыгаду. Адсюль такія ганебныя вынікі.

Цэнтар-жа ў сувязі з абвешчаным конкурсам друку шматтыражка разгарнула вялізарную работу па ліквідацыі прарыву ў выкананьні фінпляну. Па цэхах створаны штабы з прадстаўнікоў партячэйкі, камсоду і насьценгазэты, якія разгортваюць работу па ліквідацыі прарыву. Таксама створаны квіданы прарыву. Створаны агульна-заводзкі штаб па кіраўніцтве конкурсам. Усе штодзённі заводу ўключыліся ў гэты конкурс і сыстэматычна пачалі асьвятляць ход выкананьня фінпляну. Ужо выйшаў нумар шматтыражкі з разгорнутым паказам выкананьня фінпляну.

Шматтыражка пачала правяраць ход работы цэхавых камсодаў. Яно ўлічвае 6 штодзённак, прысьвечаных конкурсу.

У выніку гэтага, ёсьць значны эрэх у выкананьні фінпляну. Значна павялічыся процант ахопу рабочых палічыцца процант ахопу рабочых калектыўным страхаваньнем зыкай. Калектыўным страхаваньнем ахоплена яшчэ 40 чалавек. Ёсьць значны прыліў па ўкладах.

Але гэта першыя кроўі. Яшчэ патрэбна вялізарная работа для поўнага выкананьня фінпляну. Друк нашага заводу, уключыўшыся ў конкурс бярэ на сябе абавязацельства, каб ўсю сваю работу вялізарнай на поўнае выкананьне фінпляну.

Мы абавязуемся:

1. Сыстэматычна ў заводзкім друку асьвятляць пытаньне выкананьня фінпляну.

2. Правесьці агульна-заводзкі рейд па гэтым пытаньні.

3. Асьвятляць праз друк работу лепшых камсодаў, падцягваючы на іх вопыт адстаючых.

4. Пры радкалегіі арганізаваць дапамогчы стол па правераны выпрацоўцы на пазыках.

5. Арганізаваць у газэце гаварочую дошку актывістаў фінансавага фронту.

Выклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу шматтыражку заводу імя Сталіна (Магілёў) і Менскай абутковай.

Па даручэньні рэдкалегіі шматтыражкі «Рабочае вока»:

Адказны рэдактар МІНКІН.

Заводзкі друк у барацьбе за фінплян

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). За апошні час па радзе гомельскіх прадпрыемстваў з боку заводзкіх арганізацый зьменшылася ўвага да выкананьня фінансавага пляну чацьвёртага кварталу. Вялікая доля віны за зрыў фінпляну ляжыць на нізавым друку, які за апошні час паслабіў увагу да гэтага важнейшага вучастку барацьбы за выкананьне пляну сацбудаўніцтва.

Да гэтых газэт можна аднесьці — «Трускі» (фабрыка «Вэзуві»), «Ударнік» (фабрыка «Праца»), якія на працягу апошніх месяцаў на сваіх старонках не далі ніводнага радка аб ходзе выкананьня фінпляну.

Шматтыражкі заводаў імя Ланцуцкага, Гомсельмашу, «Пралетары», сы прамсаюзу ўключыліся ва ўсебеларускі конкурс, але практычнага яшчэ нічога не зрабілі.

Завод «Пралетары» ўключыўся ва ўсебеларускі конкурс друку ў барацьбе за фінплян і ўзяў на сябе рад сама абавязацельстваў: склікаць сход рабкораў сумесна з членамі рэдкалегіі на сьнеданьні аб конкурсе друку, дабіцца ахопу ўсіх рабочых пазыкай, арганізаваць рабкор. брыгады ў дапамогу заводзкім арганізацыям па ліквідацыі адставаньня ў выкананьні пляну паянакапленьня і выслаць спэцыяльную брыгаду рабкораў у падшэфныя калгасы для аказаньня канкрэтнай дапамогі ў ліквідацыі прарыву па фінпляне.

Завод імя Ланцуцкага мае перавыкананьне заданьня па фінпляне, але на заводзе яшчэ не ахоплены пазыкай 43 чалавека. За гэту справу ўзялася шматтыражка «Цягнік сацыялізму», якая паставіла перад сабой задачу—ні водзнага рабочага без пазыкі.

На заводзе выпускаецца спэцыяльная штодзёнка, прысьвечаная конкурсу друку.

У падшэфныя сельсаветы пасланы лепшыя фінуплыніі для ліквідацыі адставаньня па фінпляне.

Са сыстэмы Сампрамсаюзу атрымаўся вялікі разрыў паміж перапачатковай падпіскай на пазыку «4-ты завяршаючы» і яе замацаваньнем. Гэты прарыў зьяўляецца вынікам дрэнай работы заводзкай газэты— «За прамфінплян». Зараз у сувязі з уключэньнем ва ўсебеларускі конкурс, газэта «За прамфінплян» сумесна з рэдкалегіі цэхавых газэт пачала ліквідаваць гэты прарыў і ў выніку павялічыла пазыку на пазыку на 5 тысяч руб.

Задача нізавога друку Гомельшчыны — на-бліжэйшу ўключыцца ва ўсебеларускі конкурс, абвешчаны газ. «Савецкая Беларусь» і іншымі цэнтральнымі газэтамі, і ўзяць пад штодзённы кантроль работу ашчадкас і фінансавых арганізацый, паставіўшы работу так, каб яна садзейнічала выкананьню фінпляну па ўсіх паказьніках.

Барташэвіч.

Калгасныя базары павінны быць арганізаваны ва ўсіх раёнах

Адно з важных мерапрыемстваў, намечаных паходам, гэта арганізацыя сацыялістычнай сувязі паміж горадам і вёскай. Заключэньне і сапраўднае выкананьне сацыялістычных дагавораў паміж дэпутацкімі групамі прадпрыемстваў і дэпутацкімі групамі сельсаветаў і паасобных калгасаў, (па арганізацыі вывазу лішкаў сельска-гаспадарчай прадукцыі на калгасны базар, па арганізацыі сустрэчнага патоку прамтавараў для стымуляваньня калгаснага гандлю, па ўпарадкаваньні і культурным абслугоўваньні базараў) могуць на практыцы паказаць, якую вялізарнейшую ролю адыгрывае сапраўднае выкананьне рашэньня верасеньскага пленуму ЦК па вырабе прадметаў шырспажыву, у справе далейшага ўздыму дабрабыту працоўных мас гораду і вёскі і ўзмацненьня зьмычкі паміж апошнімі.

Саветы і іх масавыя зьвяньні за сваячасовае правядзеньне ў жыцьцё гэтых мерапрыемстваў павінны былі-б змагацца са ўсёй сур'ёзнасьцю. Але на сёньнешні дзень матар'ялы (за выключэньнем некаторых гарадоў і раёнаў) гавораць толькі ў лепшым выпадку аб правадзімай падрыхтоўчай рабоце да выкананьня гэтага мерапрыемства.

Трэба адзначыць, што па цэлым радзе раёнаў саветамі і іх масавымі зьвяньнямі правадзілася і праводзіцца зараз вялікая падрыхтоўчая работа па арганізацыі калгасных базараў і сустрэчнага патоку прамтавараў. Але матар'ялы яшчэ не дазваляюць сказаць аб эфэктыўнасьці праведзеных ужо базараў у цэлым радзе раёнаў. Тым ня менш гэтыя матар'ялы з усёй відавочнасьцю падцьвярджаюць, што мерапрыемствы выклікалі цікавасьць і вялікую актыўнасьць з боку дэпутатаў—сэкцыянэраў і ўсяго савецкага актыву.

Гэтымі днямі ў Полацку быў праведзен калгасны базар. Папярэдня былі накіраваны брыгады савецкага актыву ў сельсаветы. Гэтыя брыгады разгарнулі сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў масава-растлумачальную работу. У самым горадзе была праверана падрыхтаванасьць да сустрэчы калгаснага базару гандлёва-снабжэньніцкіх арганізацый. Арганізавана 6 перасовачных ларкоў. Устаноўлен належны кантроль за базарам і ахоўвай грамадзкага парадку. Устаноўлены гарадзкім вані, тэлефон і бюро даведак. Арганізаваны кансультацыі па падаткова-фінансавых пытаньнях, па пытаньнях загатовак і г. д.

11-га сьнежня у мястэчку Бобрах, Крупскага раёну ў выкананьне мерапрыемстваў, намечаных паходам, Мес саветам быў арганізаваны калгасны кірмаш, была вывезена значная колькасьць сельска гаспадарчых прадуктаў. Бобрская шавецкая арцель выпусьціла па базар прадметаў шырспажыву на 1500 руб., арцель жалезных рэчаў—на 100 руб. Базар прайшоў пры непасрэдным актыўным удзеле савецкага актыву. Па сканчэньні базару была праведзена нарада дэпутатаў і сэкцыянэраў, дзе былі падагулены вынікі праведзенай работы і намечаны далейшыя мерапрыемствы па выкананьні задач, намечаных паходам.

Цэлы рад дэпутацкіх груп прадпрыемстваў гораду Гомелю прымаюць актыўнейшы ўдзел у падрыхтоўцы да арганізацыі калгасных базараў.

Дэпутацкай групай Гомсельмашу выслана брыгада савецкага актыву ў падшэфны сельсавет, якая ўжо прарабіла вялізарную работу па падрыхтоўцы да калгаснага базару.

Пасланыя Нова-Беліцкім райсаветам брыгады ў падшэфныя калгасы правядзяць актыўную работу па заключэньні сацдагавораў на лепшую рэалізацыю пастановы верасеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб разгортваньні вырабу тавараў шырспажыву. Брыгады, пасланыя ў сельсаветы, праводзяць масавую работу па арганізацыі вывазу сельгаспрадуктаў на калгасныя базары і арганізацыі чырвоных абозаў у гонар усебеларускага паходу.

Дэпутацкія групы і сэкцыі Віцебскага Гарсавету побач з праводзімай работай па рэалізацыі абавязацельстваў па паходзе ў горадзе прымаюць актыўнейшы ўдзел у падрыхтоўцы да арганізацыі калгасных базараў.

Можна было-б падаць рад фактаў непасрэднага ўдзелу дэпутацкіх груп у правадзімай рабоце па арганізацыі калгаснага гандлю, але рад дэпутацкіх груп заключыўшы між сабой сацыялістычныя дагавары на лепшую арганізацыю калгаснага гандлю, не арганізавалі праверку гэтых дагавораў. Ад гэтуль і значнае спазьненьне з выкананьнем гэтага мерапрыемства.

Рад саветаў у выкананьні задач па паходзе яшчэ не разгарнулі адведнай работы па арганізацыі калгасных базараў. (Мазыр, Бабруйск, Рагачэў, Рэчыца і інш.). Нагнаць упушчанае—вось асноўныя задачы саветаў і іх масавых зьвяньняў. Ва ўсіх гарадох і мястэчках у парадку выкананьня сацдагавораў паміж масавымі зьвяньнямі гораду і вёскі павінны быць праведзены калгасныя базары. Мабілізаваць актыўнасьць дэпутатаў і сэкцыянэраў на выкананьне гэтага мерапрыемства—сур'ёзная задача савецкіх арганізацый.

М. Г.

Бярэм на буксір фаб. „Беларуска"

Пасьпяховае вырашэньне задач сацыялістычнага накапленьня залежыць галоўным чынам ад нас саміх, ад нашага ўменьня ўкараняць і замацоўваць гаспадарчы разьлік.

Перад намі стаіць вялізарная задача ў галіне мабілізацыі сродкаў накапленьня і іх выкарыстоўваньне для рэтучых патрэб сацыялістычнага будаўніцтва. Мабілізацыя сродкаў насельніцтва, арганізацыя зьберажэньня пляхам дабраахвотнага накапленьня сродкаў працоўных у выглядзе пазык і укладаў ашчадкасы—адна з галоўных зьвеньняў праграмы сацыялістычнага накапленьня. Гэты вучастак работы патрабуе асаблівай увагі з боку ўсіх партыйных і грамадзкіх арганізацый і ў асаблівасьці з боку цэнтральнага і нізавога друку.

Слабая ўвага да мабілізацыі сродкаў з боку партыйнай і прафэсіянальнай арганізацыі і шматтыражкі прывяла наш завод да значнага прарыву на фінансавым фронце. Так, падпіска на пазыку дала зьніжэньне на 13.000 руб. ці на 10 проц. Калектыўным страхаваньнем было ахоплена толькі 200 рабочых ці 18 проц. агульнага ліку рабочых.

У сувязі з абвешчаным конкурсам друку шматтыражка дрэнаапрацоўчага заводу імя "Молатава уключылася ў конкурс друку. Дапускаючы упартай і сумеснай рабоце партыйных і прафсаюзных арганізацый і нізавога друку, наш завод атрымаў перамогу на фінансавым фронце. На сёньнешні дзень плян падпіскі на пазыку выкананы на 100 проц. Плян паступленьня ўкладаў у ашчадкасу ад IV квартал на сёньнешні дзень выкананы на 220 проц. Значна павялічыўся процант ахопу рабочых калектыўным страхаваньнем.

Шматтыражка «Молатавец» абавязуецца: не застанаўлівацца на дасягнутых посьпехах, а яшчэ больш рашуча, па-бальшавіцку мабілізоўваць масы на выкананьне фінпляну, сыстэматычна асьвятляючы яго ход на сваіх старонках.

Дабіцца таго, каб кожны рабочы быў укладчыкам у ашчадкасу; разгарнуць сапраўдную барацьбу на заводзе зэ рэжым - эканомі на ўсіх вучастках; заняцца штодзённым асьвятленьнем ходу праверкі правільнай расстаноўкі і выкарыстаньня рабочай сілы: работу камсодаў паставіць на яшчэ большую вышыню; уключыць дэпутацкую групу ў барацьбу за фінплян; узяць на буксір фабрыку «Беларуска», якая мае прарыў на фінансавым фронце.

Па даручэньні рэдкалегіі:

рэдактар шматтыражкі ГОРСТАЎ.

Задачы саўгасных і калгасных газэт у новай абстаноўцы

Партыя паставіла перад сабой цэнтральную задачу — арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, узьняцьце ўраджайнасьці сацыялістычных палёў. Вырашэньне гэтай задачы сацыялістычнага земляробства праходзіць пры ўпартым супраціўленьні клясавага ворага. Зразумець новую абстаноўку на вёсцы — значыць зразумець тое простае бальшавіцкае правіла, што «умацоўваць калгас, узьнімаць яго гаспадарку і па - сапраўднаму паляпшаць станоўшча калгасьнікаў можна толькі пры тэй ўмове, калі ў самым калгасе вядзецца настойлівая і няўхільная барацьба за арганізацыю моцнага калгаснага актыву і за згрупаваньне вакол яго ўсёй асноўнай калгаснай масы супроць шкодніцтва з боку пралезьных ў саўгас чужых, антысавецкіх элемэнтаў, супроць лодыраў на калгасных палёх, супроць раскрадальнікаў калгаснай маемасьці, супроць антысавецкіх сабатажнікаў збожжазагатовак і іншых дзяржаўных заданьняў, першачарговасьць выкананьня якіх павінна быць зразумела ўсім калгасьнікамі, не гаворачы ўжо аб камуністах» (Молатаў).

У барацьбе за рэалізацыю гэтых задач на вёсцы **выключную ролю** па-ранейшаму адыграць наш сельскі нізавы друк—шматтыражкі і насьценныя газэты саўгасаў, МТС, калгасаў, калгасных брыгад.

У клясавых баёх за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі рос і мацнеў наш нізавы друк, наша рабселькораўская армія. Першая наша ценная газэта «Новая деревня» зьявілася ў 1922 годзе ў былой Віцебскай губерні. У 1928 годзе мы мелі ўжо 60 тыс. насьценных газэт. У 1930 годзе—200 тысяч. Асабліва бурна расьлі новыя парасткі нізавога бальшавіцкага друку ў апошнія гады. Зараз колькасьць насьценных газэт **ужо перавяліла за паўмільёна!** Насьценная газэта, як зброя ўзьдзейнічаньня на масы і форма праўдзіваньня іх актыўнасьці робіцца «адным з важнейшых форм работы партыйнай і камсамольскай ячэйкі на вёсцы» (XIII зьезд партыі).

Наш бальшавіцкі друк робіцца рукамі мільённых мас перадавых рабочых і калгасьнікаў. Рост нізавога друку азначае адначасова і рост рабселькораўскага руху. У 1925 годзе — 216 тыс., 1928—500 тыс., 1932—**звыш трох мільёнаў рабселькораў.** Гэтыя лічбы гавораць самі за сябе. Перамогшы спробы правых апартуністаў выхадзіць ціць палітычную сутнасьць рабселькораўскага руху, рабселькоры адыгралі адыгрываюць, пад кіраўніцтвам партыі, вялізарную ролю, зьяўляючыся актыўнымі памочнікамі партыі ў будаўніцтве сацыялізму.

... До самого рассвета—
На заре во всю заговорят—
Нам сидеть за стенгазетой.
Пестрые колонки строит в ряд.
Радости и ненависти сколько
В них! Пусть выглядит пестро,
Алексей Максимович! Мы только
Робко пробуем свое перо...

Так да юбілею Горката пісаў селькор Пётра Мураўёў. Пётра Мураўёў ня мае рацыі тут толькі ў адным: значная частка нашых нізавых газэт і селькораўскай арміі ўжо «паспрабавала» сваё пяро ў жорсткай клясавай барацьбе, у барацьбе за ліквідацыю кулацтва, за калгасы. Пяро многіх з многіх селькораў востра адточана клясавай нянавісьцю да ворагаў пралетарскай дыктатуры. Яно раніць іх у самае сэрца. Аб нізавым друку, аб селькорах, аб іх барацьбе напісаны раманы, аповесьці, п'есы, паэмы. Але ўсё гэта толькі ў вельмі малой ступені паказвае выключнае значэньне і канкрэтную абстаноўку барацьбы і работы людзей, якія гараць іскрай праўды, гатовы памерці за сацыялізм.

Нашыя дасягненьні бясспрэчны. Але было-б палітычнай блазарукасьцю за гэтымі дасягненьнямі не заўважыць буйнейшых недахопаў, ня ўскрыць іх, не прыцягнуць да іх рашучага зьнішчэньня мясцовыя партыйныя арганізацыі.

«Мы стварылі тысячы і тысячы калгасаў,—гаворыць т. Молатаў,—але мы яшчэ не дамаглісь таго, каб **усе** гэтыя калгасы былі нашымі калгасамі. А трэба памятаць, што калгасамі, якімі мы ня кіруем, кіруюць варожыя нам антысавецкія элемэнты. Нэйтральнасьці і тут ня існуе.» Гэтае становішча па вінна быць **цалкам перанесена** і на наш сельскі нізавы друк. Мы стварылі сотні тысяч калгасных газэт. Але ці ўсе гэтыя газэты ў сваёй практычнай рабоце чотка праводзяць бальшавіцкую лінію.

Толькі ў трох абласьцях УССР (Адэская, Харкаўская, Кіеўская) ёсьць 4 тыс. калгасных і 7 тыс. брыгадных газэт. Вялізарная арм'я! А самыя сур'ёзныя скажэньні палітыкі партыі ў мінулым годзе ня былі сваячасова ўскрыты.

На Паўночным Каўказе—18 друкаваных, 250 шклографічных шматтыражак, 2.200 насьценных газэт у МТС і калгасах, 18 тыс. брыгадных. І пры наяўнасьці такой вялізарнай сеткі партыйнае кіраўніцтва ня было сваячасова папярэджана аб сабатажы збожжазагатовак, арганізаваным кулацтвам на Кубані. На тым-жа Паўночным Каўказе мы маем ня мала выпадкаў, калі калгасныя газэты яўна патуралі кулаком.

Клясавы вораг, які пралез у калгасы, вельмі добра разумее, што друк—«самая вострая і самая моцная зброя нашай партыі» (Сталін), вельмі добра разумее ролю гэтай зброі ў клясавай барацьбе. Ён пралязае ў рады селькораў. У рэдкалегію насьценных газэт. Ён імкнецца або выбіць гэтую зброю з нашых рук, або прынамсі прытупіць яе, давесьці яе паражаючыя ўласьцівасьці да мінімуму. Хто не разумее гэтага, той не разумее законаў клясавай барацьбы. Хто не разумее гэтага, ня хоча разумець, той або безнадзейны дурань, або непасрэдны агент клясавага ворага. Або мы кіруем газэтай і тады яна выконвае пастаўленыя партыяй задачы, або мы ёю ня кіруем і тады яе скарыстоўвае ў сваіх клясавых інтарэсах супроць нас кулак. **«Нэйтральнасьці і тут ня існуе»** Так і толькі так стаіць пытаньне! Цэнтральны камітэт ня раз указваў, што партыйныя арганізацыі нясуць **непасрэдную** адказнасьць за стан нізавога друку ў іх раёне, вобласьці, краі і, ня гледзячы на гэта, **партыйнае кіраўніцтва нізавым друкам на вёсцы ўсё яшчэ яўна нездавальняючае.** Партыйныя камітэты вельмі часта нават ня ведаюць колькі ў іх газэт у саўгасах, МТС і калгасах. У патоне за колькасьцю часта за бываюцца **на якасьць,** аб неабходнасьці забясьпечыць кожную газэту моцным партыйным кіраўніцтвам.

Агляды нізавых шматтыражак і насьценных газэт на старонках цэнтральнага, абласнога і раённага друку—адна з самых дзейсных форм кіраўніцтва. ЦК абавязаў цэнтральныя, абласныя і раённыя газэты **сыстэматычна** зьмяшчаць агляды газэт, крытыкуючы іх памылкі і паказваючы іх дасягненьні, а таксама і зьмяшчаючы найбольш каштоўны матар'ял на сваіх старонках». Як скарыстоўваецца гэтая форма кіраўніцтва? Як выконваюцца дырэктывы ЦК? Агляды газэт саўгасаў, МТС і калгасаў на старонках ня толькі цэнтральнага, але нават і абласнога друку—рэдкія госьці. Ды што там цэнтральны і абласны друк! Возьмем раённы. Ўжо хто-хто, а раённая газэта абавязана на шчыльна падыйсьці да нізавога друку, зьмяшчаць агляды, абагульваць і папулярызаваць станоўчы вопыт, указваць на памылкі, **крытыкуючы дапамагаць.** І рабіць гэта сыстэматычна. Значная частка сельскіх раённых газэт не зразумела гэтай задачы, недаацаніла яе палітычнай важнасьці. Нажаль, не далёка пайшлі і тыя газэты, якія даюць агляды нізавога друку. Што гэта за агляды! Як правіла гэта бясконцае паўтарэньне прыступкі **«не» (не зрабіла, не зацікавілася, ня выканала, ня выступіла)** і стэрэатыпнае пажаданьне: «газэта (імя рэк) павінна перабудавацца». Як правіла,—гэта ўзор, **як ня трэба кіраваць** нізавым друкам, **як ня трэба яму дапамагаць.** Не такой дапамогі чакае газэта саўгасу, МТС, калгасу, калгаснай брыгады. Яна чакае падрабязнага разбору, чакае чоткай палітычнай кваліфікацыі дапушчаных памылак, разгорнутага, канкрэтнага ва ўсіх дэталях раскрыцьця паказу станоўчага вопыту.

Агляд—удалая, дзейсная, але далёка не адзіная форма кіраўніцтва. Нашы газэты пасылаюць на месцы выязныя рэдакцыі, брыгады паасобных карэспандэнтаў. У саўгасах, МТС, калгасах працуюць упаўнаважныя раённых і абласных арганізацый. Ці не зьяўляецца іх **партыйным абавязкам** дапамагчы нізавому друку, дапамагчы актыву, які групуецца вакол шматтыражак і насьценгазэт?!

Крайком, райком заслухоўваюць даклады рэд

...да на-перавыбарчай кампаніі фабзаўмясцкомаў

Пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ

Перавыбары фабзаўмясцкомаў, якія праходзяць з 15-га сынежня па 15-га лютага, павінны ператварацца ў шырокую масавую палітычную кампанію і на падставе рашэньняў II пленуму УсеЦСПС і сынежанскага пленуму ЦК КП(б)Б мабілізаваць рабочых, работніц, інжынэрна-тэхнічных работнікаў на пасляховае выкананьне прамфінпляну г. г. і баявой падрыхтоўкі рабочае класы да выкананьня канкрэтных задач 1-га году другой пяцігодкі.

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанаўляе:

1. Зацьвердзіць перавыбары з 15-га сынежня па 15-га студзеня па саюзах:

1. Саюз рабочых агульнага машынабудаўнаньня. 2. Саюз рабочых хімічнай хімі. 3. Саюз рабочых нафтавай прамысловасьці. 4. Саюз рабочых сельскага-гаспадарчага машынабудаўніцтва. 5. Саюз рабочых паперніка. 6. Саюз рабочых керамічнай прамысловасьці. 7. Саюз мэдсанпрацы. 8. Саюз працы стаўства.

II. З 1-га ПА 31-га СТУДЗЕНЯ:

1. Саюз рабочых шэрсьцяшоўкавай прамысловасьці. 2. Саюз рабочых шоўкавай прамысловасьці. 3. Саюз рабочых прам.-жыл. будаўніцтва. 4. Саюз рабочых дрэваапрацоўчай прамысловасьці. 5. Саюз рабочых сельгаспрам. 6. Саюз рабочых шклофарфоровай прамысловасьці. 7. Саюз рабочых скурнікаў.

III. З 15-га СТУДЗЕНЯ ПА 15-га ЛЮТАГА.

1. Саюз рабочых шэрсьцяшоўкавай прамысловасьці. 2. Саюз рабочых камунгаспкі. 3. Саюз рабочых земляробчых саўгасаў. 4. Саюз рабочых МТС і батрацтва. 5. Саюз рабочых жывёлагадоўчых саўгасаў. 6. Саюз рабочых гарадзкіх прадпрыемстваў і хатніх работ. 7. Саюз рабочых канцтаварыцкі і дэпартаментаў. 8. Саюз рабочых дзяржустаноў. 9. Саюз рабочых лесу і сплаву. 10. Саюз рабочых сувязі. 11. Саюз рабочых фін.-банкаўскіх устаноў. 12. Саюз рабочых мукам.-хлебн. прамысловасьці. 13. Саюз рабочых грамадзкага харчаваньня.

Устанавіўшы па саюзам: чыгуначнікаў, лесапільна-плыкавай прамысловасьці, нафтараў, чыгун. дор. шос. порт. будрабочай прамысловасьці і торфпланцыйнай прамысловасьці тэрміны перавыбараў дадаткова.

2. Прапанаваць усім ЦП саюзаў правесьці перавыбары нізавых прафарганізацый пад знакам дагэтышняга ўзьдыму пазітычнай і вытворчай актыўнасьці рабочых мас, падняцьця на вышэйшую ступень сацыяборніцтва і ўдарніцтва, разгортваньня пралетарскай самакрытыкі, узмацненьня і разьвіцьця прафсаюзнай дэмакратыі, паследнія класавай пільнасьці і баяздольнасьці прафорга, пасленьня ролі нізавых выбраных прафсаюзаў (ФЗМК, цэхкомаў і прафгруп), як арганізатараў мас, нагалоўнага ўцягненьня рабочых мас да баявога агляду-праверкі ўсіх звяньняў саюзных арганізацый у справе барацьбы за генеральную лінію партыі і вылучэньня ў саюзныя органы лепшых рабочых і работніц-ударнікаў.

3. Прэзыдыум ЦСПСБ з асаблівасьцю падкрэсьлівае, што ў разгорнутую масавую самаправерку работы прафсаюзаў павінны быць на аснове дабраахвотнага прыцягненьня ўцягнуты шырокія масы рабочых, іх жонак, работніц, піянэраў, школьнікаў, зацьвярджаючы на перавыбарчых сходах рабочых-брыгадзіраў праверачныя брыгады з складу лепшых ударнікаў і актывістаў.

Прэзыдыум ЦСПСБ ставіць задачай перад усім прафарганізацыямі, каб ускрытыя самаправерачнымі брыгадамі недахопы зараз зьліквідаваліся з тым, каб брыгадзіры пры справаздачах на агульных сходах рабочых паведамлялі аб прынятых мерах.

Разам з гэтым прэзыдыум ЦСПСБ «бавязвае ўсе прафарганізацыі з пачатку перавыбарчай кампаніі арганізаваць збор рабочых прапаноў па паляпшэньні прафсаюзнай работы пад ўчёт прапанову па палепшэньні прафработы».

4. Для практычнай дапамогі нізавым прафарганізацыям у перавыбарах мабілізаваць 100 курсантаў рэсп. школы прафруху, залічваючы гэтую работу, як вытворчую практыку.

Даручыць аргаддзелу і прав. выкананьня складзі актыў з 50 чалавек пры ЦСПСБ, з членаў прэзыдыуму, пленуму, апарату ЦСПСБ і ЦП саюзаў для праверкі падрыхтоўкі да перавыбараў і аказаньня дапамогі асобным прадпрыемствам.

5. Абавязаць гарразпрафсавет разгарнуць масавую палітычную работу па перавыбарах ФЗМК і арганізацыі спаборніцтва паміж прафгрупамі, цэхавымі камітэтамі і ўнутры прадпрыемстваў і паміж прадпрыемствамі на пасляховае правядзеньне перавыбарчай кампаніі, за лепшую мабілізацыю мас на выкананьне прамфінпляну і палепшаньне матар'яльна-бытавога абслугоўваньня рабочых мас.

У мэтах забясьпечаньня практычнай дапамогі з боку ГРПС у перавыбарчай кампаніі абавязаць ГПС правесьці пімі ж 15-XII і 25-XII сходы гарадзкога і раённага прафактыву па гэтым пытаньні і прыцягваць членаў прэзыдыуму, пленуму ГПС да вядучых прадпрыемстваў на ўвесь час перавыбараў для практычнай дапамогі ў гэтай кампаніі.

5. Прапанаваць ГРПС і ЦП саюзаў цалкам падпарадкаваць задачам перавыбарчай кампаніі ўсю сетку культурных устаноў: прэмійны фонд для прэміяваньня лепшых гаррайпрафсавету, ФЗМкомаў, цэхавых камітэтаў. Даручыць камісіі ў складзе тт. Плешакова (старшыня), Левіна і Ленцнер-Алоўскай (Наўк. прадстаўн. газэты «Труд») прадставіць на зацьверджаньне сакратарыяту ЦСПСБ умовы конкурсу.

8. Даручыць шэфбюро на працягу 3-х дзён распрацаваць канкрэтны план удзелу шэф. арганізацый у перавыбарчай кампаніі.

9. Абавязаць арг. аддзел і аддзел статыстыкі забясьпечыць дакладны вучот і аператыўную сыстэматычную інфармацыю аб ходзе кампаніі.

10. Даручыць аргаддзелу ЦСПСБ, ЦП саюзаў і ГРПС арганізаваць шырокае асьвятленьне ў цэнтральных і раённых газэтах падрыхтоўкі і ходу справаздачна-перавыбарчай кампаніі, забясьпечыўшы на старонках друку абмен станоўчым вопытам работы і дамагчы здатаючым нізавым прафарганізацыям.

11. Прэзыдыум ЦСПСБ ад імя пралетарыяту БССР выклікае савпроф Зах. вобласьці на сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае правядзеньне перавыбарчай кампаніі ФЗМК.

Прэзыдыум ЦСПСБ упэўнены, што прафарганізацыі Беларусі ў часе перавыбараў пад выпрабаваньнем бальшавіцкім кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, даючы руйнуючы адпор усялякім клясава-варожым вылазкам, правым апартуністам і «лявацкім» заскокам пакажуць узоры бальшавіцкай сваёй работы ў мабілізацыі мас на выкананьне чарговых гаспадарча-палітычных задач і далейшай перабудовы прафсаюзнай работы, на падставе рашэньняў 9-га ўсесаюзнага зьезду прафсаюзаў і другога пленуму УсеЦСПС.

Перадавы нацыянальны сельсавет

Польскі нацыянальны Новадворскі сельсавет Заслаўскага раёну Беларускай ССР знаходзіцца на самай граніцы з Панскай Польшчай.

У гэтым сельсавеце налічваецца 268 гаспадарак. Сельскі савет калектывізаваная абота забясьпечыла магчымасьць вывесьці сельскі савет на перадавыя пазіцыі выкананьня гаспадарча-палітычных кампаній.

Наколькі Новадворскі сельсавет меў магчымасьць справіцца з пастаўленымі перад ім задачамі, відаць з наступных паказьнікаў.

Плян веснавой пасеўнай кампаніі па сельсавеце выкананы на 106 проц. і ва ўстаноўленыя тэрміны. Прычым, калі адзін з калгасаў адставаў у выкананьні пляну пасеўнай кампаніі, сельсаветам быў арганізаваны грамадзкі буксір дапамогі адстаючаму калгасу з боку перадавых.

У час падрыхтоўкі і ўборкі ўраджаю сельскі савет мабілізаваў усю грамадзкасьць на выкананьні пляну ўборачнай кампаніі. Было арганізавана шырокае абмеркаваньне пляну ўборкі на агульных сходах калгасьнікаў, поўны ўлік наяўнасьці рабочай сілы і неабходнасьць правільнай расстаноўкі яе. Гэтыя арганізацыйныя мерапрыемствы сельскага савету забясьпечылі датэрміновае выкананьне пляну ўборкі ўраджаю і асабліва сенажаці.

Ня ў меншай меры выкананьню пляну ўборкі садзейнічала арганізацыя штодзённых насьценных газэт у брыгадах. Работа насьценных брыгадных газэт была наладжана так, што да заканчэньня рабочага дня газэта падагульвала вынікі работы брыгады і паказвала, хто горш і хто лепш працаваў на працягу дня. Асабліва добра працавала насьценная брыгадная газэта ў калгасе «Чырвоны захад».

Разам з тым у кожным калгасе былі вызначаны пераходныя грашовыя прэміі за лепшыя паказьнікі работы брыгад у часе ўборачнай кампаніі як адносінах сваячасовасьці, так і лепшай якасьці ўборкі ўраджаю.

Плян збожжазагатовак па сельсавеце выкананы па калгасным сэктары на 100 проц., па аднаасобным—на 85 пр. Плян адгрузкі бульбы Ленінграду выкананы поўнасьцю і датэрмінова. Так сама поўнасьцю выкананы плян азімага пасеву. Па сёлсаваньні плян выкананы на 75 проц., па мясазагатоўках—на 97, па лёнавалакне—на 45 і лёнасемян—77 проц.

Фінансавы плян у бягучым квартале сельсаветам выкананы на 106 проц. У галіне прыцягненьня ўкладчыкаў у ашчадкасы плян значна перавыкананы. Пры заданьнях па ўкладах у 1000 руб., прыцягнена ўкладчыкаў на 4.000 руб. Па падпісцы на пазыку па калгасным сэктары заданьне выканана на 110 пр. Паасобныя члены савету, як напрыклад, тав. ДУБОВІК КАЗІМІР, старшыня дэпутацкай групы калгасу «Чырвоны баец» распаўсюдзіў пазыкі сярод калгасьнікаў пры заданьні ў 800 рублёў—на 1100 рублёў, сярод ад наасобнікаў замест 100 руб— на 110 руб.

У чым сакрэт посьпехаў Новадворскага сельсавету і яго старшыні тав. ЖЫЗЬНЕЎСКАГА?

Сакрэт посьпехаў у рабоце Новадворскага сельсавету ў тым, што ўсе мерапрыемствы партыі і ўраду сельскі савет праводзіць праз масы і з самой масай працоўных.

Якое-б там ні было мерапрыемства, ці то рашэньне партыі і ўраду аб збожжазагатоўках, разгортваньні калгасна гандлю, аб рэвалюцыйнай законнасьці, разьвіцьці жывёлагадоўлі, тав. Жызьнеўскі, раней чым прыступіць да яго ажыцьцяўленьня, праводзіць шырокую растлумачальную работу сярод шырокіх працоўных мас. Няма ніводнага важнейшага закону, ніводнага рашэньня партыі і ўраду, пра якія-б ня ведалі шырокія масы калгасьнікаў і працоўныя аднаасобнікі.

Уся заслуга тав. Жызьнеўскага ў тым, што ён у сваёй дзейнасьці абапіраецца на моцны створаны ім актыў. Актыву па сельсавеце налічваецца звыш 100 чалавек, якія аказваюць сапраўдную вялізарную дапамогу ў рабоце сельскага савету.

Т. ЖЫЗЬНЕЎСКІ — старшыня польскага нацыянальнага Новадворскага сельсавету Заслаўскага раёну.

Напрыклад, па сельскім савеце быў прарыў у выкананьні пляну лесазвазкі. Старшыня сельсавету тав. Жызьнеўскі, убачыўшы, што яму тут справіцца надзвычайна цяжка, арганізаваў нядзельнік членаў Асоавіяхіму, якіх па сельсавеце налічваецца 145 чал. і дзякуючы гэтаму мерапрыемству прарыў быў ліквідаваны.

Таксама неабходна адзначыць, што сельсавет не пакінуў без увагі і такі вучастак работы, як работа сэкцый і дэпутацкіх груп сельскага савету. Пры сельскім савеце арганізавана 6 сэкцый і 3 дэпутацкія групы ў калгасах, якія налічваюць актыву 65 чал. Даклады сэкцый і дэпутацкіх груп аб іх дзейнасьці сельскі савет заслухоўвае на сваіх паседжаньнях.

Пытаньні культурнай работы занялі ў дзейнасьці Новадворскага сельсавету таксама належнае месца. На тэрыторыі сельсавету ёсьць 5 школ, з іх 4 польскіх і 1 беларуская. Арганізавана на 5 ліквпунктаў, ёсьць хата-чытальня і чырвоны куток у калгасе. Усе дзеці школьнага ўзросту ахоплены ўсеагульным навучаньнем. Улічаны поўнасьцю няпісьменныя і малапісьменныя, якія акуратна наведваюць ліквпункты. У бягучым годзе (запаўнівае старшыня сельсавету тав. Жызьнеўскі) няпісьменнасьць па сельсавеце будзе ліквідавана цалкам.

Наколькі ўзмацнелі калгасы Новадворскага сельсавету відаць ужо хаця-бы з папярэдняга разьмеркаваньня ўраджаю.

На працадзень у калгасах Новадворскага сельсавету па папярэднім разьмеркаваньні ўраджаю ў сярэднім пры падае 8-10 кілё бульбы, 1,5 кілё жыта, 400 грамаў пшаніцы, 400 грамаў аўса, 300 грамаў ячменю. Грашыма ня менш 100 рублёў атрымаў кожны калгасьнік на рукі за прапрацаваны час. З кармамі для жывёлы недахопу не адчуваецца.

Цікава адзначыць, што ў выніку шырокай прапрацоўкі закону аб новым адначасовым падатку на аднаасобныя гаспадаркі, 15 аднаасобных бядняцка-сераднякіх гаспадарак падалі заявы аб уступленьні ў калгасы.

У выніку правільнага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі Новадворскі сельсавет паказвае лепшыя ўзоры працы, мабілізацыі мас на выкананьне гаспадарча-палітычных кампаній, барацьбы з клясавым ворагам і заслугоўвае выдзяленьня яго, як перадавога сельскага савету Саюзу ССР.

РУСОВІЧ.

Пра вызначэньне фондаў заработнай платы

Пастанова ЦКК НК-РСІ БССР і НКПрацы БССР ад 17-XII 1932 г.

ЦКК НК-РСІ і НКПрацы БССР ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ: у выкананьне пастановы СНК СССР ад 3-XII—32 г. пра фонды зарплаты:

1. Абавязаць усе наркаматы цэнтральныя ўстановы і арганізацыі да 22-га сынежня 1932 г. устанавіць па сваіх апаратах і па ўсіх падпарадкаваных ім гаспадарчых аб'яднаньнях і трэстах цьвёрдыя фонды зарплаты на 1933 год.

2. Фонды зарплаты па кожнай установе павінны ўстанаўляцца з разьліку дыфэрэнцыяваных сярэдніх ставак зарплаты, зацьверджаных НКПрацы (мінімальных і максымальных) па кожнай пасадзе паасобна—пасьля скарачэньня штатаў ЦКК НК-РСІ.

Ужываньне толькі максымальных ставак пры вылічэньні фондаў зарплаты —катэгарычна забараняецца.

3. Да агульна-вылічанага ў адпаведнасьці з п. 2 гэтай пастановы фонду зарплаты дадаць суму, якая складае розьніцу ў аплаце пэрсанальных ставак спэцыялістам, устаноўленым НКПрацы па працягу 1932 г. супроць сярэдніх акладаў, прадугледжаных схэмамі НКПБ на 1932 г.

4. Для ажыцьцяўленьня кантролю над правільным вызначэньнем фонду зарплаты, стварыць пры ЦКК НК-РСІ Бел. камісію ў складзе т. т. Касьцюковіча (старшыня), Гольдэнбэрга (НКПрацы), Адама (ЦСПСБ), Вароніна (НКФ) і Мікульскага (Дзяржбанк).

5. Устаноўленыя па наркаматах, цэнтральных установах, гаспадарчых аб'яднаньнях і трэстах фонды зарплаты —прадставіць не пазьней 23-XII—32 г. у НК-РСІ Бел.

Работу па праверцы фондаў зарплаты камісіі скончыць не пазьней 26-XII—1932 года.

6. Гэтую пастанову апублікаваць у газэтах.

Старшыня ЦКК КП(б)Б НК-РСІ Бел.

Лычоў.

ЧВА Наркома працы БССР

Коньнікаў.

У Чэрвеньскім, Бярэз'нскім і Магілеўскім раёнах

становішча ўсенавучу малапісьменных нездавальняючае

Усенавуч малапісьменных ў Чэрвеньскім раёне не стаіць у цэнтры ўвагі паасобных раённых арганізацый і на ват аддзелу нарасьветы. 14-га сынежня загадчык РайАНА вестка аб ходзе ўсенавучу і ліквідацыі няпісьменнасьці меў толькі на 27 лістапада.

Па раёне налічваецца 3403 малапісьменных, якія падлягаюць усенавучу. і 1129 няпісьменных. Аб становішчы вучобы ў сельсаветах РайАНА ня ведае. Паводле даных на 27 лістапада з 86 школ для малапісьменных адкрыта толькі 39, вучобай на гэты тэрмін было ахоплена 1250 малапісьменных і... 193 няпісьменных.

Ды правядзеньня масавага агляду становішча ўсенавучу раённыя арганізацыі адносяцца фармальна. На бюро РК КП(б)Б і на прэзыдыуме РВК быў да абгаворана справаздача загадчыка РайАНА, былі вынесены адпаведныя пастановы. Пастановы пушчаны па сельсаветах і ячэйках, вось і ўсё. На месцы ня былі накіраваны брыгады. Рай выканком дагэтуль не заслухаў справаздачы ніводнага сельсавету аб ходзе ўсенавучу малапісьменных.

Яшчэ горш справы ў Бярэзінскім раёне. Аб гэтым раёне «Савецкая Беларусь» пісала ўжо не адзін раз.

У малавы агляд становішча ўсенавучу малапісьменных раённыя арганізацыі нагат не палічылі патрэбным уключыцца. Ні на райкоме партыі, ні на прэзыдыуме РВК, ні на райкоме камсамолу пытаньне аб правядзеньні аглядзу ўсенавучу нават і не ставілася. Раённы аддзел нарасьветы—пустое месца: няма ні загадчыка РайАНА, ні інспэктараў-мэтадыстаў.

З месяцы назад быў прызначан інспэктар палітасьветы—адзіны працаўнік на ўвесь РайАНА.

Няма ў раёне і старшыні райкому працасьветы: былы старшыня кінуў работу і паехаў працаваць настаўнікам ў школу.

Фактычна райком саюзу зараз зусім не працуе.

Паводле далёка няпоўных вестак у Бярэзінскім раёне налічваецца 8679 малапісьменных і 2536 няпісьменных. На ўсю колькасьць няпісьменных па словах палітпісьветаспэктара працуе толькі 9 ліквпунктаў, якімі ахоплена... 130 чалавек. Мала чым лепш і справа з увядзеньнем усенавучу малапісьменных. У раёне ганебнейшы прарыў, але ніхто з раённых арганізацый ня думае, аб тым, жаб прыняць меры за ліквідацыі апошняга.

Мы патрабуем ад Наркамасьветы і ЦП прасьветы накіраваць у Бярэзінскі раён спэцыяльную брыгаду з заданьнем больш дэтлёва дасьледаваць справу культбудаўніцтва ў раёне і прыняць меры да ўкамплектаваньня РайАНА і ажыўленьня работы райкому працасьветы.

Па Магілёўшчыне была арганізавана масавая праверка рашэньняў сакавікоўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б. У час праверкі была пастаўлена задача зрушыць з месца работу па ўвядзеньні ўсенавучу малапісьменных. Пытаньнем усенавучу займаліся бюро райкому партыі, райвыканком і гарсавет. Ва ўсе 29 сельсаветаў раёну выехалі брыгады для разгортваньня работы на месцах, быў абвешчан пяцідзёньнік штурму па ліквідацыі прарываў усенавучу. Брыгады на месцах разам з сельскімі арганізацыямі правялі перавучот няпісьменных і малапісьменных. За бязьдзейнасьць зьнят з работы падтасьветаспэктар.

На сёнешні дзень РайАНА мае стэлы весткі па 26 сельсаветах, па якім налічваецца малапісьменных 4698 чал. і няпісьменных 3139 чал., але справа з разгортваньнем вучобы ўсё яшчэ працяжвае заставацца незадавальняючай. Паводле прыблізных вестак вучобай ахоплена ня больш 50 проц. няпісьменных і малапісьменных. Віна за гэта ляжыць на сельсаветах і партячэйках, якія ў большасьці лічаць справу усенавучу другарадным, абнаваты і РайАНА, які не наладзіў аператыўнага кіраўніцтва. На прэзыдыуме РВК дагэтуль ніводзін з сельсаветаў не зрабіў справаздачы аб сваёй рабоце ў галіне ліквідацыі няпісьменнасьці, у галіне ўсенавучу малапісьменных. Райкам гасподаз упарта не жадае займацца гэтай важнейшай справай, ён ня мае ніват учёту няпісьменных і малапісьменных калгасьнікаў. Камсамол Магілёўшчыны дагэтуль ня вылучыў культармейцаў.

Становішча з увядзеньнем ўсенавучу малапісьменных па ўказаных раёнах нельга прызнаць здавальняючым. **Мы ставім пытаньне перад Наркамасьветы—ў бліжэйшы час заслухаць справаздачы гэтых раёнаў і прыняць адпаведныя меры, каб усенавуч быў ажыцьцёўлены на справе.**

Брыгада «Сав. Бел.» В. Зайцаў, Пятроўская.

Арганізаваць ячэйкі садзейнасьці па забясьпечаньню пал'вам

У сувязі з разгортваньнем прамысловасьці, з ростам патрэб сацыяльна-культурных і сацыяльна-бытавых устаноў насельніцтва ў паліве, асабліва ўзрасьлі запатрабаваньні да лясной і торфяной гаспадарак. А між тым за апошні час мы маем недапушчальна вялікае падзеньне выкананьня плянаў загатовак і вывазкі дроў і торфу. Гадавы плян торфаздабычы выкананы толькі на 65 проц., плян загатовкі дроў у III квартале выкананы ўсяго на 26 проц.

IV квартал павінен быў даць значны пералом. Невыкананьне плянаў у гэтым квартале азначае, бязумоўна, прарыў на гым ці іншым вучастку народнай гаспадаркі.

Прайшло два месяца IV кварталу, а квартальны плян загатоўкі вывазкі дроў выкананы менш, як на 10 проц. Ні адно з прадпрыемстваў, апроч БелДРЭС'у, Менскай электрастанцыі, «Герой працы» і Магілёўскага, торф ня вывозіць. У лесе ляжыць каля 6.000.000 складачных мэтраў дроў, на торфраспрацоўках—каля 1.000.000 тон торфу, а на прадпрыемствах і ў рабочых няма паліва.

Прадпрыемствы чакаюць добрай санняй дарогі. Усе чакаюць дроў ад Лесазбыту, вугаліо з Данбасу і нафту з Баку.

Цэнтральны камітэт КП(б)Б і Савет народных камісараў прызналі становішча з палівам пагражаючым. Яны пастанавілі абвясьціць месячнік штурму на фронце апалу. 900 тысяч складачных мэтраў дроў і 200 тысяч тон торфу павінны быць вывезены на чыгуначныя станцыі, на прадпрыемствы і ў гарады.

Кожны леспрамгас атрымаў цьвёрдую праграму загатоўкі і вывазкі дроў у сьнежні; кожная торфараспрацоўка і кожнае прадпрыемства атрымалі праграму вывазкі торфу. Гэтыя заданьні могуць і павінны быць выкананы.

Трэба толькі як сьлед узяцца за выкананьне. Канцылярскім і бюракратычным спосабам тут не дапаможаш. Трэба падняць рабочыя і калгасныя масы. Трэба давесьці да кожнага рабочага і калгасьніка, што нармальная работа прадпрыемстваў, забясьпечаньне рабочай гаспадаркі і шырокага рынку пра мысловай прадукцыяй залежыць у значнай ступені ад паступленьня паліва і, ў першую чаргу, ад паступленьня торфу.

Трэба давесьці да кожнага працоўнага гораду, што забясьпечаньне палівам яго квартэры, школы, больніцы, сталоўкі ў значнай ступені залежыць ад яго самаго. Неабходна мабілізаваць усе сродкі і магчымасьці прадпрыемстваў на вывазку торфу і дроў. Гуктранспарт і аўтатранспарт заводаў трэба кінуць на вывазку торфу і дроў, трэба павялічыць выпрацоўку тавараў шырокага спажываньня, чым будзе стымулявацца пасьпяховая вывазка паліва.

Арганізаваць на заводах ячэйкі па садзейнасьці забясьпечаньню прадпрыемстваў палівам, па эканоміі і рацыянізацыі паліва, уцягнуць у гэтыя ячэйкі шырокія масы рабочых—гэта задача трыкутнікаў усіх прадпрыемстваў

«ПАІЧ»

Л. БЭНДЭ

Аб клясавай барацьбе на культурным вучастку

Некалькі заўваг па сутнасьці

I

Агульна вядомым зьяўляецца той факт, што заваёвы сацыялізму ў нашай краіне забясьпечаны не на аснове «клясавага міру» з капіталістычнымі элементамі, а ў працэсе жорсткай і ўпартай клясавай барацьбы супраць эксплёататарскай клясы, супраць недабітых яе рэшткаў. Гэта і зрабілася цяпер неабходнай формулай, без разуменьня сэнсу якой нельга арыентавацца ў сутнасьці тых працэсаў, сьцягваньняў і зьмяшчэньняў, якіх мы пазіраемся.

Але-ж гэтай агульна-правільнай формулы недастаткова. Кожны этап клясавае барацьбы мае свае спэцыфічныя формы, уласьцівыя ёй складанасьці, но вы формы не правільныя.

Наша перамога, на любым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва, ёсьць удар па клясавым ворагу, ёсьць узьмацненьне пралетарскае дыктатуры. Ёсьць наблізьненьне да канчатковай на будовы бесклясавага грамадзтва.

Тактыка барацьбы нашага ворага не такая простая, як гэта можна чакаць у творах нашых бальшэвікоў-пісьменьнікаў. Яна складаная і тонкая. Яна не зьяўляецца выдумкай, а вынікае з клясавай сутнасьці гэтага ворага, з тых канкрэтных абставін, у якіх яму прыходзіцца дзейнічаць, абараняцца, шкодзіць.

Рэзалюцыя XVII партыйнай канфэрэнцыі ясна гаворыць: «Што і ў далейшым яшчэ ня ўхільна абвастрэньне клясавай барацьбы ў асобных момантах і асабліва ў асобных раёнах і на паасобных вучастках сацыялістычнай будоўлі...». Культурны вучастак сацыялістычнай будоўлі: навука, мастацтво і літаратура не зьмяўляецца нейкім выключэньнем, вызваленым ад агульных працэсаў, што адбываюцца ў краіне. Працэсы клясавай барацьбы ў краіне знаходзяць свае адмеўтраваньне, спэцыфічнае праламленьне і на гэтым вучастку. Культурны вучастак сацыялістычнай будоўлі зьяўляецца тым вучасткам, дзе асабліва складаная і тонкая тактыка клясавага ворага. Ды яно і зразумела. Гэты вучастак ёсьць вучастам ідэалёгіі.

Той факт, што СССР канчаткова заваяваўся на сацыялістычных асновах, пасьпяхова завяршае першую пяцігодку ў чатыры гады, пераможна пады ходзіць да штурму другой пяцігодкі, пяцігодкі канчатковай ліквідацыі клясаў,—відавочна і яскрава пазбаўляе ка літалістычных элементы надзеі на магчымасьць рэстаўрацыі. Капіталістычныя элементы ліквідуюцца, перамагаюцца пераважнай капіталізму ў экаяміцы і сьвядомасьці людзей. Але-ж гэтае зусім не азначае, што рэшткі капіталістычных элементаў, якія пад ударамі сацыялізму гінуць, спынілі ўжо сваю барацьбу.

Асаблівасьць БССР, як і іншых рэспублік са складаным нацыянальным пераразьмешчаньнем, такая, што варожая пралетарыяту ідэалёгія досыць часта праяўляецца ў выглядзе альбо вялікадзяржаўнага шавінізму, альбо шавінізму мясцовага характару.

Агульна вядомы посьпехі нашае партыі ў справе будаўніцтва сацыялізму, ў справе ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, разьвіцьцяй на ліквідацыю фактычнай нераўнасьці, якая засталася нам у спадчыну ад царска-капіталістычнага калёніяльнага рэжыму. Гэтых посьпехаў партыя да сягнула дзякуючы непрымірымай барацьбе на два фронты — супроць правага і «левага» апартунізму, дзякуючы непрымірымай барацьбе на два фронты і ў нацыянальным пытаньні.

Наша партыя вяла і вядзе бязьлітасную барацьбу супраць вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, дзе-б і якім ён ні праяўляўся. Гэтай барацьбой забясьпечваецца пасьпяховы рост і росквіт культур нацыянальных народаў Беларусі, зараз ва ўсю велічэ пробашагае вперад. На вялікі жаль гэтая праблема цалкам адносіцца і да нашых газэт. Нават не бачнася памыліна, гэтую праблему можна пашырыць і на мастацкую літаратуру. Пытаньне якасьці мовы зараз паўстае на рад намі, як адна з умоў далейшага паглыбленьня беларусізацыі, далейшага росту нашае культуры. А між тым да гэтага часу няма ніводнай навуковай пошукі на пытаньнях мовы, не разьвіты насьпеўны выхад за мэжы туру мовы, за яе абагачэньне. Гэтаму не могуць служыць апрацаваньнем бясспрэчныя заслугі работнікаў мова знаўчага фронту ў барацьбе супраць нацдэмаўскага мовазнаўства. Трэба памятаць, што для таго, каб сапраўды зьнішчыць нацдэмаўскае мовазнаўства, для гэтага недастаткова сказаць, альбо напісаць «гэтае няправільна», «гэтае шкодна»,—трэба ўпарта працаваць у запатрэбнай напрамку, зьнішчаць нацдэмаўскае стварэньнем нашага камуністычнага. Сапраўды, дзі ка гучыць той факт што да гэтага часу няма нават адзінства ў тэрміна ліёй. Напрыклад, як мовадь цэлых, альбо поезд. Тое-ж і з правапісам. Акаць ці окаць. Тут поўная анархія і неразьбярыха. Адсутнічае і масавая шырокая работа над культурай мовы, над укараненьнем новых разуменьняў, новых словаўтварэньняў, якія зьяўляюць на аснове росту сацыялізму. Усё гэта ёсьць па сутнасьці праяўленьнем з боку работнікаў мовазнаўчага вучастку нацыяналізацыі, індывідэрэнтызму і бесклапотнасьці да важнейшага пытаньня культуры і аб'ектыўна зьяўляецца тормазам у справе росту беларускай культуры нацыянальнай па форме—сацыялістычнай па зьместе.

За апошнія часы пачынае ўзьнімаць галаву з разьбітым тварам і беларусі нацыянал-дэмакратызм, ажыцьцяўляецца беларускі шавінізм. Формы яго праяўленьня таксама не адназтойны і не заўсёды простыя і адкрытыя. На некаторых апошніх вылазках нацыянал-дэмакратызму, на правах беларускага нацыяналізму ў галіне літаратурна-крытычнай патрэбна падрабязна спыніцца, каб выкрыць іх і нанесьці ім сакрушальны ўдар.

Гэтае ў сваю чаргу паказка адну з новых форм, у якой спрабуе нацыянал-дэмакратызм і беларускі шавінізм актывізавацца на сучасным этапе. Мы маем на ўвазе ў першую чаргу артыкул Сідарэнкі «Шлях паэта», зьмешчаны ў № 6-7 часопісі «Беларусь Калгасная».

II

Ажыцьцяўляючы палітыку будаўніцтва сацыялізму, ленінскую нацыянальную палітыку, наша партыя заўсёды ўважліва і клапатліва адносілася і адносіцца да мастацкае літаратуры, стварае найбольш спрыяльныя ўмовы для яе росту і росквіту. Той бясспрэчны рост мастацкай літаратуры, з якім яна прышла да XV гадавіны Кастрычніка, забясьпечаны дзякуючы кіраўніцтву партыі, дзякуючы яе ўвазе, дзякуючы той барацьбе, якою на па партыя праводзіла і праводзіць супраць буржуазнага, у розных яго формах, уплыву на савецкую літаратуру. Наша партыя стварыла ўмовы для выяўленьня і росту, і забясьпечыла тэты рост новых літаратурна-мастацкіх творчых сіл з асяродзьдзя рабоча-сялянскіх мас.

У той жа час наша партыя ніколі не станавілася сьлепой да той літаратурнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай спадчыны, якую пралетарыят адрымаў ад папярэдняга сацыяльнага ладу. На на партыя ніяўхільна ажыцьцяўляла і ажыцьцяўляе наказ Леніна аб тым, што «мы з кожнай нацыянальнай культуры бярэм толькі яе дэмакратычныя і яе сацыялістычныя элементы, бярэм іх толькі і бязумоўна ў процівагу буржуазнай культуры, буржуазнаму нацыяналізму кожнай нацыянальнасьці». Але-ж гэта зусім не азначае, што мы павінны абмежавацца толькі адной спадчынай, што мы не павінны стварэць новых мастацкіх каштоўнасьцей, адпаведных вэлічы новай эпохі. Ленін вучыў: «Захоўваць спадчыну—зусім ня значыць абмяжоўвацца спадчынай». Усямерна дапамагаючы выяўленьню і росту новых літаратурна-творчых сіл з асяродзьдзя рабочых і сялянскіх мас, наша партыя заўсёды стварала і стварае ўсе магчымасьці прадпрыемствам на вывазку торфу і дроў. Гуктранспарт і аўтатранспарт заводаў трэба кінуць на вывазку торфу і дроў, трэба павялічыць выпрацоўку таваraў шырокага спажываньня, чым будзе стымулявацца пасьпяховая вывазка паліва.

Арганізаваць на заводах ячэйкі па садзейнасьці забясьпечаньню прадпрыемстваў палівам, па эканоміі і рацыянізацыі паліва, уцягнуць у гэтыя ячэйкі шырокія масы рабочых—гэта задача трыкутнікаў усіх прадпрыемстваў

«ПАІЧ»

Аб клясавай барацьбе на культурным вучастку

Некалькі заўваг па сутнасьці

I

Агульна вядомым зьяўляецца той факт, што заваёвы сацыялізму ў нашай краіне забясьпечаны не на аснове «клясавага міру» з капіталістычнымі элементамі, а ў працэсе жорсткай і ўпартай клясавай барацьбы супраць эксплёататарскай клясы, супраць недабітых яе рэшткаў. Гэта і зрабілася цяпер неабходнай формулай, без разуменьня сэнсу якой нельга арыентавацца ў сутнасьці тых працэсаў, сьцягваньняў і зьмяшчэньняў, якіх мы пазіраемся.

Але-ж гэтай агульна-правільнай формулы недастаткова. Кожны этап клясавае барацьбы мае свае спэцыфічныя формы, уласьцівыя ёй складанасьці, но вы формы не правільныя.

Наша перамога, на любым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва, ёсьць удар па клясавым ворагу, ёсьць узьмацненьне пралетарскае дыктатуры. Ёсьць наблізьненьне да канчатковай на будовы бесклясавага грамадзтва.

Тактыка барацьбы нашага ворага не такая простая, як гэта можна чакаць у творах нашых бальшэвікоў-пісьменьнікаў. Яна складаная і тонкая. Яна не зьяўляецца выдумкай, а вынікае з клясавай сутнасьці гэтага ворага, з тых канкрэтных абставін, у якіх яму прыходзіцца дзейнічаць, абараняцца, шкодзіць.

Рэзалюцыя XVII партыйнай канфэрэнцыі ясна гаворыць: «Што і ў далейшым яшчэ ня ўхільна абвастрэньне клясавай барацьбы ў асобных момантах і асабліва ў асобных раёнах і на паасобных вучастках сацыялістычнай будоўлі...». Культурны вучастак сацыялістычнай будоўлі: навука, мастацтво і літаратура не зьяўляецца нейкім выключэньнем, вызваленым ад агульных працэсаў, што адбываюцца ў краіне. Працэсы клясавай барацьбы ў краіне знаходзяць свае адмеўтраваньне, спэцыфічн

ЗА ГРАНІЦАЙ

Праграмная прамова Шлейхера

Уласны карэспандэнт «Правды» піша з Бэрліну ад 16 сьнежня.

Калі каротка ахарактарызаваць гадзінную прамову аб праграме новага габінэту, сказаную па радыё рэйхсканцлерам Шлейхерам, дык яе можна зьвесьці да наступных пунктаў:

1. Урад мае ў намеры працягваць ажыцьцяўленьне эканамічнай праграмы Папэна.

2. Урад ужывае сацыяльныя манэўры з мэтай стварэньня фашысцкага настрою ў масах.

3. Урад рэзка адмяжоўваецца ад мэтадаў парламантарызму.

4. Урад не шкадуе пагроз на адрас кампартыі.

Гаспадарчая праграма ўраду Шлейхера адпавядае патрабаваньням Крупа, якія высунуты на нарадзе агульна-германскага саюзу прамыслоўцаў. Захоўваючы ў аснове папэнаўскую праграму «ажыўленьня» гаспадаркі, урад разам з тым адмаўляецца ад усякіх валютных і палітычных экспэрымэнтаў, роўна як і «палітычныя авантурыстычныя камбінацыі».

З другога боку, каб забясьпечыць інтарэсы аграрнага капіталу, ўрад абяцае яшчэ да каляд павялічыць мыты на сельскагаспадарчыя прадукты, якія ўвозяцца з-за граніцы.

Значная частка прамовы была прысьвечана манэўрам, разьлічаным на ашуканьне мас.

Канцлер не прызнае розьніцы паміж капіталізмам і сацыялізмам.

Шлейхер заявіў, што ён ганарыцца тым, што яго называюць «сацыяльным генэралам». Падкрэсьліваючы «сацыяльны дух» армії, Шлейхер заклікаў усе пласты насельніцтва да супрацоўніцтва. Ён асабліва падкрэсьліваў праведзеную ім адмену надзвычайнага дэкрэту Папэна аб скарочаньні зарплаты і заявіў, што зьяўляецца прыхільнікам захаваньня сацыяльнага закона даўства. Гэтыя чыстакі прамовы былі вёўна разьлічаны на тое, каб утварыць аснову для палітыкі, якая праводзіцца нацыянал-сацыялістамі і рэфармісцкімі прафсаюзамі і для падтрыманьня ўраду. Шлейхер рэзка выступіў супроць пастановы бюджэтнай камісіі аб адмене надзвычайнага дэкрэту Папэна аб зьніжэньні дапамог беспрацоўным, інвалідам вайны і т. д.

Узмоцнена падкрэсьліваючы свае варожыя адносіны да ўсякіх экспэрымэнтаў над канстытуцыяй, Шлейхер спасылаўся на неабходнасьць утварэньня шырокай масавай апоры для фашысцкай дыктатуры. Ён патрабаваў, каб рэйхстаг падтрымліваў урад.

Па адрасе камуністычнага руху Шлейхер выступіў з віднейшымі пагрозамі. Ён адкрыта заявіў, што абвяшчаньне ў адной асобе пасады рэйхсканцлера і ваеннага міністра мела на мэце падкрэсьліць усю сур'ёзнасьць становішча) і што гэта зроблена для ўзмацненьня націску на рэвалюцыйны рух.

Закранаючы беспасрэдна Камінтэрн, **Шлейхер пагражаў тым, што ўжо падрыхтаваны дэкрэт аб аканчальным прыдушэньні камуністычнага руху і што гэты дэкрэт у любы момант можа быць прыведзены ў дзеяньне.** Далей ён заявіў, што ў выпадку неабходнасьці **будуць выданы драконаўскія, выключныя законы супроць кампартыі і будзе мабілізаваны рэйхсвэр для барацьбы з камунізмам.**

Гэтыя пагрозы супроць рэвалюцыйнага руху неабходна паставіць у сувязь з імкненьнем Шлейхера заручыцца падтрыманьнем нацыянал-сацыялістаў і рэфармісцкіх прафсаюзаў і стварыць для ўраду шырокую масавую апору.

Перайшоўшы да пытаньня аб Прусіі, Шлейхер даў зразумець нацыянал-сацыялістам, што калі яны не возьмуць на сябе адказнасьці за агульна-германскую палітыку, дык ня можа быць і гаворкі аб тым, каб яны маглі разам з партыяй цэнтру фармаваць Прускі ўрад.

Пытаньні зьнешняй палітыкі Шлейхер закрануў толькі паўсходзь.

Жэнэўскі кампраміс у пытаньні раўнапраўя Германіі Шлейхер назваў «буйным крокам наперад».

Пакараньні сьмерцю, расстрэлы ў Індакітаі

ПАРЫЖ. 17-XII. Радыкальная «Рэпюблік» зьмяшчае артыкул Андрэ Франка пад загалоўкам: «Кампанія Індокітай». Аўтар артыкулу прыводзіць тэлеграму з Індакітаю аб пакараньні сьмерці 5 анамітаў. У артыкуле гаворыцца, што такія казьні практыкуюцца ў Індакітаі бесьперапынна. «Ня гледзячы на маўчаньне афіцыйнага друку, гаворыць Франк,—шум маніфэстацый, расстрэлу і паўстаньняў даходзіць да нас. Што-ж там адбываецца?».

Франк прыводзіць заяву журналіста Рубо, спэцыяліста па Далёкаўсходніх пытаньнях, і добра знаёмага с становішчам у Індакітаі. Рубо гаворыць, што па ўсім Індакітаі нясьціха на адбываюцца дэманстрацыі сялян. Туземная гвардыя па загаду начальства страляе ў дэманстрантаў. Кожны раз астаюцца 10—20 забітых. Па думцы Рубо, за апошні год колькасьць забітых дэманстрантаў сялян дасягае 800. Праводзяцца масавыя арышты. Ён прысутнічаў пры адлітве параходу на Гвіяну, на як'м сярод крымінальных было больш 1000 палітычных вязьняў. «Паміж анамітамі і французамі,—гаворыць Рубэ,— прорва нарастае».

Салідарн сьць забастоўшчыкаў у Францыі

ПАРЫЖ. 17-XII. Забастоўка докераў у Гаўры і Дзюнкерхе працягваецца з папярэднім упарствам. У Гаўры да докераў далучыліся грузчыкі вугалю, каманды парусных суднаў, рабочыя партовых кранаў і возчыкі. У Юнкерхе агульны сход бастуючых адобрыў адказ забастовачнага камітэта на манэўр прадпрыемстваў і паста навіў узмоцніць пікетаваньне.

«Юманітэ» паведамляе аб узрастаючым руху салідарнасьці ў сувязі з забастоўкай. Так, у Гаўры докеры адна галосна пастанавілі адлічыць ад сваёй забастовачнай дапамогі па адным франку ў карысьць неарганізаваных якія зусім не атрымліваюць дапамогі

Каманда прыбыўшага ў Гаўр амэрыканскага судна «Пайльпсон Кванц», даведаўшыся аб забастоўцы, адмовілася ад разгрузачных работ на гледзячы на пагрозы камандаваньня. Партовыя рабочыя ў Калэ адмовіліся разгрузіць вялікае грузавое судно «Лібэрці».

Арышт 1300 камуністаў у Парыжы

ПАРЫЖ. 17-XII. «Юманітэ» паведамляе што па заклику Цэнтральнага камітэту дзеяньня парыскага раёну некалькі тысяч работнікаў транспарту, электрычнай станцыі, манэтнага двара, газавай станцыі і вадаправоду ўдзельнічалі ў масавым сходзе на Пляс Д'опэра. Калёне работнікаў манэтнага двара і калёне работнікаў газавай станцыі ўдалося наладзіць дэманстрацыю на бульварах. Паліцыя арыштавала звыш 1.300 чалавек. На дарозе ў паліцэйскія вучасткі арыштаваныя крычалі: «далоў зьніжэньне заработкаў» і пелі «Інтэрнацыянал».

Масавыя арышты камуністаў

БЭРЛІН. 17-XII. За апошнія два дні у розных частках Германіі праведзены масавыя аблавы і арышты сярод камуністаў. Учора ў Кельне паліцыя ўчыніла налёт на сход актыву кампартыі, прычым было арыштавана 37 удзельнікаў сходу. У Мюнхэне паліцыя ўчыніла налёт на скліканы кампартыяй сход дэлегатаў сельскіх раёнаў Баварыі. Прызначаная на заўтра канфэрэнцыя рэвалюцыйных сялян Баварыі забаронена.

Учора Мюнхэнская паліцыя ўчыніла налёт на сход рэвалюцыйнага саюзу барацьбы супроць фашызму і арышт пішала ўдзельнікаў гэтага сходу—61 рабочага. У Проэбрэйтэнбасе (Турынгія) паліцыя ўчыніла вобыскі на кватэрах амаль усіх членаў мясцовай арганізацыі кампартыі. Пры гэтых вобысках паліцыя канфіскавала шматлікія легальныя брашуры і кнігі пад выдам, што яны зьяўляюцца «антыдзяржаўнымі». У часе вобыскаў арыштавана 20 членаў кампартыі. У Вюртэмбэрзе паліцыя правяла вобыскі ў памяшканьні 50 мясцовых арганізацый МОПР у розных гарадох краіны.

Камфракцыя патрабуе ануляваньня рэпэрацый

БЭРЛІН. 17-XII. Як паведамляе «Бэрлінэр фольксцайтунг», учора на паседжаньні камісіі рэйхстагу па замежных справах камуністычная фракцыя ўнесла прапанову аб ануляваньні лёзаянскай згоды аб рэпарацыях. Гэтая прапанова была паводле вестак газэты, адхілена, прычым нац.-сацыялісты, якія выступілі са сваёй звычайнай дэмагагічнай крытыкай лёзаянскай згоды устрымаліся ад галасаваньня, забясьпечыўшы такім чынам, адхіленьне камуністычнай прапановы.

Беспрацоўныя разьбіваюць магазыны

Уласны карэспандэнт «Известий» паведамляе з Бэрліну ад 16 сьнежня «Пасьля дэманстрацыі беспрацоўных ў Бэрліне і радзе іншых гарадоў, учора адбыліся буйныя дэманстрацыі беспрацоўных у **Гамбурзе. Беспрацоўныя дэманстравалі** адначасова ў розных частках гораду, прычым **разьбілі многа магазынаў з харчовымі прадуктамі і вопраткай.**

Унутрыпартыйная дыктатура Гітлера

БЭРЛІН. Пасьля адыходу ў адпачынак Штрасэра, Гітлер і бліжэйшыя да яго лідэры нацыянал - сацыялістычнай партыі прынялі тэрміновыя меры прысмерсы з мэтай папярэдзіць далейшае разбурэньне нац - сацыялістычнай партыі. У арганізацыйнай структуры нац. - сацыялістычнай партыі праведзены значныя зьмены, каб забясьпечыць неабмежаваную ўнутрыпартыйную дыктатуру Гітлера.

Гітлер выдаў загад аб назначэньні камісараў для кіраўніцтва ўсімі абласнымі арганізацыямі нац - сацыялістычнай партыі, а таксама загад аб роспуску так званай «эканамічнай рады нац.-сацыялістычнай партыі», кіраўніком якой быў «тэарэтык» партыі Годфрыд Фэдэрэ. Адначасова з гэтым Гітлер прызначыў сваім «дарадчыкам па эканамічных пытаньнях» былога рэдактара эканамічнага аддзелу «Бэрлінэр бэрзен цайтунг» Функа — даверанай асобы пэўных прамысловых колаў.

Супроць „камітэту 19"

ТОКІЁ. 17-XII. Адбылося экстранае паседжаньне савету міністраў па пытаньні аб рэзалюцыі «камісіі 19-ці», дзе зацьверджаны інструкцыі, якія адпраўляюцца міністэрствам замежных справаў японскай дэлегацыі ў Жэнэву. Паводле вывестак агэнцтва Сымбун Рэнго, ў інструкцыі падкрэсьліваецца «недапушчальнасьць спасыланьняў на пакт 9-ці дзяржаў, які ня мае непасрэдных адносін да статуту Лігі нацый». Тое-ж самае зазначаецца ў адносінах да 9 і 10 разьдзелаў дакладу Літона.

У інструкцыі адзначаецца, што «ўзгаджальны камітэт, які арганізуецца, можа мець толькі тэхнічны характар у адносінах да задачы вывучэньня манчжурскага пытаньня. Японскі ўрад, за значаецца ў інструкцыі,—ня можа згадзіцца з запрашэньнем ПАЗШ і СССР, якія не зьяўляюцца членамі Лігі нацый. У інструкцыях адзначаецца, што нават у выпадку прыняцьця японскіх паправак да рэзалюцыі, японскі ўрад пакідае ў моцы агаворку, якая заключаецца ў супярэчаньні супроць арганізацыі «камітэту 19-ці» супроць ужыцьця 10 разьдзелу статуту Лігі нацый.

Пажар у Токіё

ТОКІЁ. 16-XII. Сёньня ў цэнтры Токіё згарэў буйнейшы ўнівэрмаг «Сіроката». Пакуль зарэгістраваны: 10 забітых, 50 цяжкапараненых і звыш 100 лёгкапараненых. Страты перавышаюць 4 млн. іен.

Забастоўка трамвайшчыкаў Тамагары

ТОКІЁ. 16-XII. Сёньня забаставалі 300 рабочых такійскага прыгараднага трамваю ў Тамагары, патрабуючы адмены зьніжэньня заработку і палепшаньня ўмоў працы. Стачка падтрымліваецца такійскім прафсаюзам транспартнікаў. Усе газэты прадбачаць, што паліцыя ўмяшаецца ў забастоўку па прыкладзе таго, як гэта было зроблена ў часе стачкі такійскіх трамвайшчыкаў.

Хроніка

Вынікі літаратурнага конкурсу

▲ Наркамасьветы БССР вызначыў да XV гадавіны Кастрычніка рад прэмій за лепшыя літаратурна-мастацкія творы, напісаныя савецкімі пісьменьнікамі за час Кастрычніка на Беларусі.

1-ю прэмію за лепшы літаратурны твор атрымаў **Міхась Чарот**, другую — **Янка Галавач** і **Ізі Харык**. 3-я прэмія прысуджана **Міхасю Зарэцкаму**. Пісьменьнікі—**Броўка, Кульбак, Аксэльрод і Глебка** атрымалі дзьве 4-ыя прэміі. 5-ю прэмію атрымаў **Бужан**. Таксама 5-ая прэмія атрымана ударнікамі, заклікаными у літаратуру **Дзехцярэм і Шведзікам**.

За лепшыя драматычныя творы дзьве 1-ых прэміі атрымалі **Рыгор Кобец і Кузьма Чорны, Курдзін**—2-ю прэмію. 3-ю прэмію ніхто не атрымаў. 4-ю—**Гурскі**.

1-ая прэмія за музычныя творы падзелена паміж **Аладавым і Туранковым**, 2-ю прэмію атрымаў **Чуркін, Падонскі**—3-ю.

Апрача гэтага за музычныя афарбленьні пяці прэміраваны **Цыкошкі і Іваноў**.

▲ **НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧУЮ БАЗУ** ў галінах вэтэранасьвеціраваць, вывучэньня калектываў жывёлы і гэнэтыкі трусоў, авец і сьвіней стварае ў 1933 годзе Віцебскі Вэтэзамузэй.

▲ **50.000 РУБ.** адпушчана гарадзкім саветам таварыству «Прыхільнік дзяцей» на пашырэньне дабрачынага адпачынку ў Расіцкіх. Прапускная здольнасьць дому павялічыцца з 330 да 480 чал.

▲ **194.000 КВ. М, НОВАЙ ЖЫЛОЙ ПЛОШЧЫ** будзе пабудавана ў 1933 годзе па лініі Белкысаюзу па БССР. На будаўніцтва асыгнавана 27.820.000 руб.

▲ **ГАНАРОВУЮ ГРАМАТУ** па конкурсе на лепшую сталоўку атрымала сталоўка пры Віцебскай фабрыцы «Дзьвіна».

▲ **НОВЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР** адкрыты ў Полацку.

Барацьбу ... работы--на вышэйшую ступень

(З пленуму ЦП працасьветы)

Даклад аб выніках справаздачна-перавыбарчай кампаніі вызвах праф арганізацый асьвятчыкаў і спрэчкі выявілі, што справаздачна - перавыбарчая кампанія была праведзена пад лозунгам мабілізацыі шырокіх мас асьветчыкаў і працоўнага насельніцтва на барацьбу за рэалізацыю пастаноў ЦК партыі аб школе і пастановы ЦВК СССР аб ВНУ і тэхнікумах.

Вучэбна - вытворчыя нарады за час правядзеньня кампаніі пачынаюць займаць належнае месца ў рабоце школ; вытворчыя нарады пачалі разгортваць сваю работу, накіроўваючы яе на лепшую арганізацыю педпрацэсу, на ўзьняцьце якасьці вучобы. Па водле далёка няпоўных вестак, на школах БССР налічваецца 276 настаўнічых брыгадаў, але зьмест работы апошніх прафарганізацыямі дагэтуль ня вывучаны.

За час правядзеньня кампаніі мы маем значны рост ўдарніцтва: толькі па 13 раёнах лік ударнікаў за гэты перыяд павялічыўся на 886 чал., ударнікі бяруць на сябе канкрэтныя абавязацельствы, у аснову якіх пакладзена добрая падрыхтоўка і правядзеньне лекцый, павышэньне сваёй кваліфікацыі. Настаўнік правільна зразумеў сваю задачу ў справе выхаваньня пакаленьня, здольнага канчаткова ўстамавіць камунізм.

У некаторых раёнах за час кампаніі прафарганізацыі дабіліся палепшаньня матар'яльна - бытавога становішча настаўніка: адкрыты ў радзе месц настаўніцкія сталоўкі, настаўнікі прымацаваны да сталовак ІТР, да ЗРК.

У Чэрвеньск'м, Магілеўскім і некаторых іншых раёнах прафарганізацыі правялі ініцыятыву ў сэнсе разгортваньня самазагатовак, што значна паляпшае забясьпечаньне настаўнікаў.

Адначасова ёсьць і рад вельмі сур'ёзных недахопаў. Ня ўсюды барацьба за рэалізацыю пастаноў ЦК партыі аб школе і ЦВК аб ВНУ і тэхнікумах узьнята на належную вышыню. Перабудова работы школы, тэхнікумаў і ВНУ праходзіць недастаткова тэмпамі. Месцамі наўмысна спавяліваюць за гібы ў практыцы школьнага будаўніцтва ва бластайна ў нутадах выкладаньня. У асобных выпадках мы маем і крэн правую практыку, калі ў школе ідзе сапраўдная дуброжка; ў асобных выпадках ёсьць тэндэнцыі замкнуцца ў сьцяных школы. Наркамасьветы і ДВБ вельмі слаба забясьпечылі школы падручнікамі, вельмі дрэнна ў гэтых адносінах у нацменаўсіх школах. У цэлым радзе выпадкаў школы дахадзіцца ў кепскіх матар'яльных умовах; ў «недарэмантаваных» школах, амаль без вучэбных дапаможнікаў, без палітэхнічнага абсталяваньня. Па літэхнізацыя школы яшчэ не пастаўлена на належную вышыню. У большасьці раёнаў матар'яльна - бытавое абслугоўваньне асьветчыкаў пастаўлена на далёка не на належную вышыню. На пленуме падавалася цэлы рад агідных фактаў ігнараваньня дырэктыў партыі і ўраду ў галіне забясьпечаньня настаўнікаў. У Мазырскім і радзе іншых раёнаў па 2—3 месяцы не выдаюцца настаўнікам прадукты харчаваньня. У Аўцюхоўскім сельсавеце настаўнікам адмовілі выдаць хоць некалькі кілёграм бульбы. У Сьмілавіцкім раёне некаторыя прафработнікі працасьветы прадукты і праматавары разьмеркавалі паміж сабой, заняўшы радавую настаўніку, што ў гэтым квартале нічога не атрымае.

Пленум пастанавіў уключыць у курс друку на лепшае выкананьне фінпляну IV кварталу, пастаўшы задачай — піводнага мясцкому, школы і культустановы без насьценгазэты і не вуднай насьценгазэты — пад'ем удзельнікаў конкурсу друку.

П-ч.

Плян

правядзеньня масавых агульна-гарадзкіх мерапрыемстваў у сувязі з уступленьнем у другую пяцігодку

1. Правесьці 22-XII—32 г. агульна-гарадзкі зьлёт інжынэрна-тэхнічных работнікаў гораду.

а) Задачы ІТР у сувязі з уступленьнем в другую пяцігодку (на аснове рашэньняў 5-га ўсесаюзнага зьезду спэцыялістаў).

Адказныя за зьлёт т. т. ШЧАГЛОЎ і ДОДЗІН.

2. Правесьці 24-XII канфэрэнцыю ўкладчыкаў ашчадкас і камсодаў.

Не парадак дню канфэрэнцыі паставіць пытаньні:

а) 10-цігодзьдзе ашчадсправы і камсодаў і іх далейшыя задачы па мабілізацыі фін. сродкаў у 2-й пяцігодцы.

б) Уручэньне пераходнага сьцягу імя ГК КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

в) Рапарты калектываў.

Адказныя за канфэрэнцыю т. т. ЭЛЬПЭРЫН і ЖАЛЕЗНЫ.

3. Правесьці 26-XII агульна-гарадзкі зьлёт герояў 1-й пяцігодкі.

На парадак дню зьлёту паставіць пытаньні:

а) Сацыялістычная праца ў СССР і задачы ўдарніка ў 2-й пяцігодцы.

б) Выступленьні герояў першай пяцігодкі.

в) Выступленьні лісьменьнікаў аб героях першай пяцігодкі.

г) Рапарты лепшых гаспадарча-разьліковых брыгад.

Да зьлёту выдаць часопіс, прысьвечаны паказу лепшых герояў пяцігодкі, лепшых ударных брыгад, паказу іх дасягненьняў, а таксама задачам ударніка ў другой пяцігодцы.

Для арганізацыі выдаваньня часопісу вызначыць рэдкалегію ў складзе т. т. ГРЫЦКЕВІЧА, КАЖДАНА, АЛЕКСАНДРОВІЧА, ГАЛАВАЧА, ХАРЫКА, ФІШБЭЙНА, ЦЕМКІНА, БАЙКАЧОЎА, СЛУЦКІНА і ЛЕВІНАЯ.

Арганізацыю фото-вітрыны лепшых герояў першай пяцігодкі ускласьці на т. т. ПАЛІЧАНСКАГА і ШЭВЭЛЬМАНА.

Адказныя за зьлёт т. т. БАЙКАЧОЎ і МАЛЕЙ.

4. Арганізаваць масавы вечар сустрэчы другой пяцігодкі—31-XII у Доме культуры.

Зацьвердзіць наступны парадак правядзеньня вечару:

а) Задачы другой пяцігодкі набудовы бязклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

б) рапарты лепшых прадпрыемстваў.

в) выступленьні пісьменьнікаў.

Адказны за правядзеньне вечару тав. КУДРАЕЎ.

5. Упрыгожаньне гораду 31-XII і 1-I—33 г. ускласьці на гарсавет (вуліцы, плошчы), кіраўніцкі прадпрыемстваў і ўстаноў (будынкі, прадпрыемствы), ГОПС, бюро п-к і ячэек (цэхі, клюбы, чырвоныя куткі).

6. Забараніць бюро п-к і ячэек праводзіць 26-XII і 31-XII—32 г. агульныя сходы, канфэрэнцыі і зьлёты на шкоду прадпрыемствам.

7. Для дапамогі прадпрыемствам у правядзеньні масавых мерапрыемстваў, зьвязаных з уступленьнем у другую пяцігодку, а таксама падрыхтоўцы да агульна-гарадзкіх мерапрыемстваў—Агіт-Масу і ГОПС прымацаваць да прадпрыемстваў на адным тавары шу з ліку цэнтральнага і гарадзкога актыву.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

У НАВУКОВА - ДАСЬЛЕДЧЫМ ІНСТЫТУЦЕ (Гомель) ВЫТВАРАЮЦЦА ВОПЫТЫ ПА ВЫЛУЧЭНЬНІ З БЯРОЗАВЫХ АПІЛАК САХАРУ.

НА ЗДЫМКУ: акадэмік — ударнік ШКАТЭЛАЎ за вопытам.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што ў Бягомлі 25-XII—1932 г. а 10-й гадзіне раніцы будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б па разглядзе апэляцыйных партпрацаў Бягомельскага і Плешчаніцкага раёнаў.

На 25-XII—32 у Бягомлі:

1. Калечанка А. А., 2) Буландо Х. А., 3) Панцялеєў Н. М., 4) Буландо М. Т., 5) Курныш М. В., 6) Касікаў П. Д., 7) Шыло Я. Ан., 8) Мароз Я. С., 9) Пярэдня К. Г., 10) Лазар Ю. З., 11) Красковіч А. П., 12) Шыпенка Т. А., 13) Пручкоўскі П. П., 14) Карнійкі І. А., 15) Гаўрылавіч М. М., 16) Грынкевіч А. П., 17) Шыло Р. Б., 18) Добыш П. С., 19) Кабяк Я. М.

у Плешчаніцах:

20) Хадановіч М. Я., Дабрыцкі Я. Л. Абавязкова прадстаўленьне на ПТ характарыстыкі аб апошняй працы.

Член ПК ЦКК КП(б)Б Сьцяпняк

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 гадз. Ад 19-га сьнежня мастацкі фільм вытворчасьці Саюзкіно ВЕЦЕР У ТВАР Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно.

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА, Савецкая, 68
19 га сьнежня а 7-й гадзіне ўвечары СХОД-СУСТРЭЧА
народнага паэты ЯКУБА КОЛАСА з пісьменьнікамі з прычыны 50-цігадовага яго юбілею.
Уваход вольны. Запрашаюцца рабочыя-ўдарнікі

СЭСІЯ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК
ПРЫСЬВЕЧАНАЯ
ўзьняцьцю ўраджайнасьці сел. гаспадаркі,
адбудзецца
ў г. Менску, 20-XII 1932 г. а 19 гадзіне ў Доме Комасьветы
Парадак дня:
1. Задача навукі ў барацьбе за ўзьняцьце ўраджайнасьці сельскай гаспадаркі—дакл. першы Віцэ-Прэзыдэнт тав. Домбаль.
2. а) Праблема хімізацыі сельскай гаспадаркі БССР—дакл. акад. Кедраў-Зіхман і вуч. спэц. Пратасеня. б) Роля хіміі ў барацьбе з хваробамі с-гасп. культур—дакл. вуч. спэц. Дарожкін.
3. Прыродна-кліматычныя ўмовы БССР і праблема ўзьняцьця ўраджайнасьці:
а) Кліматычныя магчымасьці БССР у справе ўзьняцьця ўраджайнасьці—дакл. праф. Кайгарадаў.
б) Натуральны і культурны рэльеф палёў БССР, як фактар узьняцьця ўраджайнасьці—дакл. акад. Афанасьеў.
в) Мэтады асваеньня балот БССР і магчымыя вынікі гэтага асваеньня ў другой пяцігодцы—дакл. вуч. спэц. усесаюзн. балотнага інстытуту Дакукін
4. а) Праблема новых культур у БССР—дакл. вуч. спэц. тав. Ганчарык. б) Новыя культуры на асушаных балотах БССР—дакл. вуч. спэц. усесаюзнага балотнага інстытуту Шыперка.
5. Вытворчы плян навукова дасьледчай працы АН БССР на 1933 г.—дакл. прэзыдэнт АН БССР акад. Горын.
6. Праект статуту АН БССР—дакл. неадменны сакратар акадэмік Панкевіч.
Прэзыдыум АН БССР

Беларускае аддзяленьне Лёнаканаплябуду
ПАВЕДАМЛЯЕ,
што Крычаўскі, Віцебскі і Гомельскі будвучасткі ЛІКВІДУЮЦЦА
Установы і асобы, якія маюць прэтэнзіі, павінны прадявіць іх ліквідацыйным камісіям будвучасткаў да 31-XII г. г. Пасьля гэтага тэрміну прэтэнзіі прымацца ня будуць.
Бел. аддз. Лёнаканаплябуду

Друкарня імя СТАЛІНА

ПАСТАНОВА № 36
Прэзыдыуму Менскага Гарадзкога Савету ад 29-XI-1932 г.
Аб невыкананьні пастаноў: а) СНК БССР аб абавязковай рэгістрацыі ў Інспэктуры Наргасуліку ўсіх прамысловых прадпрыемстваў сацсэктару і б) Э анамічнай нарады БССР аб пастановуцы ўліку фондаў заработнай платы і колькасьці персаналу.
Адзначыць, што некаторымі прадпрыемствамі сацсэктару, ня гледзячы на неадназразовыя нанамінкі Інспэктурай Наргасуліку, да гэтага часу ня выкананы пастановы: а) СНК БССР ад 4-VIII г. г. аб абавязковай рэгістрацыі да 6-IX г. г. усіх прадпрыемстваў у Інспэктуры Наргасуліку і б) пастановы Экана БССР ад 22-VII г. г. аб пастановуцы ўліку фондаў заработнай платы і колькасьці персаналу.
Прэзыдыум ПАСТАНАЎЛЯЕ
1) Загадчыка Плянава-эканамічнага аддзелу дрэваапрапоўчага заводу імя Молатава тав. Кара іка, дырэктара Бавна-прачашнага Трасту тав. Марголіна, галоўнага бухгальтара пагальнага заводу № 5-6 тав. Гарбарэ, бухгальтара скрыначнай майстэрні Камітэту Узаемадапамогі тав. Бацьвіньніка, галоўбуха друкарні СНК тав. Гяршовіча—аштрафаваць за невыкананьне паказаных пастаноў, на 100 руб. кожнага.
Дырэктароў с ўгасаў: «Заціша»—тав. С віпкага, Дасьледча-сьвінагадоўчай гаспадаркі - тав. Шэгіна, Балотнае гаспадаркі—тав. Альфаровіча, імя Будзённага—тав. Удэлз, Сеніца—тав. Мініч і калгасаў: імя Лекерта—тав. Бурак і «Новы сьвет» т. Шорэц—аштрафаваць на 75 руб кожнага.
Старшыню арцелі „Дрэваапрапоўшчык" тав. Вігдорчыка аштрафаваць на 50 руб.
2) Прапанаваць усім прамысловым і сельска-гаспадарчым (саўгасам і калгасам) прадпрыемствам, пад адказнасьць дырэктароў штомесячна, не пазьней 5 числа наступнага за справаздачным месяцам, прадстаўляць у інспэктуру наргасуліку канюнктурныя даныя па ўліку працы.
3) Абавязаць старшынь праўленьняў калгасаў у 5 дзённы тэрмін зарэгістраваць у інспэктуры наргасуліку належачыя калгасу прадпрыемствы і майстэрні.
Нам. старшыні Менскага гарсавету Каранеўскі
Сакратар гарсавету Люцько.

На падставе пастановы НКЗ му СССР і НКЗ БССР ад 29 лістапада 1932 г. Беларуская кантора „Мінэральныя ўгнаеньні" ЛІКВІДУЕЦЦА
з перадачай усіх яе функцый Белсельгасснабу. Усе ўстановы і асобы, якія маюць прэтэнзіі да Беларускай канторы „Мінэральныя ўгнаеньні" павінны заявіць аб гэткіх ліквідкому не пазьней 1-га студзеня 1933 г.
Пасьля паказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць
Прэтэнзіі накіроўваць: Менск, Савецкая, 46, Белсельгасснаб ліквідкому
ЛІКВІДКОМ.

На падставе пастановы прэзыдыуму Віцебскага гарсавету ад 9-га сьнежня 1932 году Віцпрамтрэст в 10 г. м-ца ЛІКВІДУЕЦЦА
Для ліквідацыі справаў Віцпрамтрэсту вылучан ліквідком. Прэтэнзіі па справах былога прамтрэсту прымаюцца ліквідкомам да 25 сьнежня 1932 г. пасьля чаго ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць
Адрас ліквідкому: г. Віцебск, гарсавет Савецкая вул пакой №42

ЗАВОЧНЫ СЭКТАР ВЫШЭЙШАГА ПЭДІНСТЫТУТУ
склікае з 1 па 15 студзеня 1933 г.
ЛЯБАРАТОРНА-ЗАЛІКОВУЮ СЭСІЮ.
На сэсію выклікаюцца студэнты 3 курсу, 2 курсу 2-га прыёму і 1 курсу 4 прыёму (веснавога набору).
Кожнаму студэнту, якому патрэбна зьявіцца на сэсію, паслана асабістае паведамленьне.
Завочны сэктар ВПІ.

УСІМ РАЙСНАБАМ
Дакладу ўраду прышлеце выверанымі даныя жывёлазагатовак дваццатага сьнежня сумесныя подпісы райснабу райканторы Заготжывёлы форма паслана
НАРКАМСНАБ КАСЬЦЕВІЧ.

Даводзіцца да ведама ўсіх цэнтральных, раённых прадпрыемстваў і ўстаноў, што для атрыманьня зарплаты неабходна ў абавязковым парадку прадстаўляць
1. Разам з касьлянам асобную даведку аб зацьверджаным фондзе зарплаты вышэйстаячай арганізацыі, НКПрацы або РСІ.
2. Не пазьней як за два дні да тэрміну выдачы зарплаты—плацежную ведамасьць.
3. На адвароце касьляну рабіць даведачны надпіс аб тэрмінах выплаты пэнсіі прадугледжаных калдагаворам,
4. Пры прадстаўленьні пляну на кожны наступны месяц прадстаўляць таксама вестку аб фактычных выдатках па фондзе зарплаты за мінулы месяц (уключаючы як выплаты даўнымі, так і ўсе ўтрыманьні)
Касьляны на 1 квартал і студзень месяц 1933 г. неабходна прадставіць не пазьней 20-XII г. г.
Не прадставіўшыя ў тэрмін касьляну і на выканаўшыя адной з пералічаных вышэй умоў будуць пазбаўлены магчымасьці атрымаць сродкі.
Усебелкантора Дзяржбанку

На падставе загаду па Галоўдартрансу БССР,
5 дарожна-будаўнічы вучастак з 15 сьнежня 1932 г.
ЛІКВІДУЕЦЦА
Просьба да ўсіх установаў і асоб, якія маюць прэтэнзіі да вучастку, падаваць іх у ліквідком (г. Н. Барысаў, памяшканьне Учдора 706) да 1-га студзеня 1933 г.
Пасьля гэтага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць
ліквідком

Любыя парцыі
дзікарослыя плады (грушы-дзічкі, яблыкі-лясянкі, каштаны, жолудзі, букавы і кедравы арэх)
купляе Маскоўская кафэ-дзітычная ФАБРЫКА
З прапановай зварочацца: Масква, 5, кафэ-фабрыка. Тэлеграфны адрас: Масква, кафэ-фабрыка.

ЗГУБЛЕНЫ:
квіток, выд. фабрыкай „Беларусь" і квіт., выд. балотнай станцыяй на імя калгасу «Свабода» і розныя квіты, выд. прыгарадным сельсаветам на імя М. БАЦЬВІНЬНІКА,
лічыць страціўшымі моц

Згублены від на візу, на імя Марыса Гаравіца, № 100510 ад 20-V 1932 г., выд. Магілеўскім РВК, лічыць страціўшым моц.

Згубленую дамавую кнігу дому на вул. Тарасаўская на базоце на імя Канцава Г. Г., лічыць страціўшай моц.

Прыблудзілася карова
Прыметы: чорна-рабая (галандка), 13гоп, сярэдняга росту. Знаходзіцца ў калгасе „Левінскі Шлях" (в. Вуйчхавічы) Пазгайскага с-с, Менскага району.

Згубленую дамавую кнігу дому № 1 па Шырокай вул., лічыць страціўшай моц.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу А—53.